**МАРГУН Сяргей Рыгоравіч** (1891 г.), загінуў у 1943 г.

**МІХНЕВІЧ Віктар Рыгоравіч** (1926 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

**МІХНЕВІЧ Лідзія Рыгораўна** (1935 г.), падарвалася на міне ў 1943 г.

**ПЕРАГУД Вера** (1870 г.), загінула ў маі 1944 г.

**РАДЗІВОНАВА Агапа Іванаўна** (1907 г.), закатавана ў красавіку 1944 г.

**СКОРАЯ Настасся Фёдараўна** (1890 г.), загінула ў маі 1944 г.

**ШУМСКІ Міхаіл** (1870 г.), забіты ў сакавіку 1944 г.

**ШУМСКАЯ Марыя** (1874 г.), закатавана ў сакавіку 1944 г.

ВЁСКА ПЕРАБІТАЯ ГАРА

**БАГУК Васіль Іванавіч** (1925 г.), расстраляны ў 1942 г.

**ТАРАСЕВІЧ Уладзімір Аркадзьевіч** (1927 г.), падарваўся на міне ў 1942 г.

ВЁСКА ЧАЛЮШЧАВІЧЫ

Ліхую гадзіну перажылі людзі 22 чэрвеня 1942 г., калі ў вёсцы лютаваў карны атрад...

**АЛЕКСЕЕВІЧ Віктар Мікалаевіч** (1941 г.), спалены 22.6.1942 г.

**АЛЕКСЕЕВІЧ Мая Мікалаеўна** (1938 г.), спалена 22.6.1942 г.

**АЛЬХІМОВІЧ Антон Антонавіч** (1932 г.), расстраляны ў лютым 1943 г.

**АРЦЮХ Васіліна Сяргееўна** (1924 г.), спалена 22.6.1942 г.

**АРЦЮХ Пелагея Тодараўна** (1884 г.), загінула 22.6.1942 г.

**АРЫНОВІЧ Аверкій Якаўлевіч** (1880 г.), спалены 22.6.1943 г.

**АРЫНОВІЧ Марына Аляксандраўна** (1880 г.), забіта 22.6.1943 г.

**АРЫНОВІЧ Міхаіл Аверкіевіч** (1905 г.), расстраляны 20.2.1943 г.

**БЕЛЬСКАЯ Вольга Прохараўна** (1927 г.), забіта 20.1.1943 г.

**БЕЛЬСКАЯ Клаўдзія Прохараўна** (1920 г.), расстраляна ў 1942 г.

**БЕЛЬСКАЯ Марына Фядосаўна** (1880 г.), забіта 20.1.1943 г.

**БЕЛЬСКІ Аксент Прохаравіч** (1919 г.), расстраляны 23.7.1942 г.

**БЕЛЬСКІ Мікалай Пракопавіч** (1927 г.), вывезены ў Германію і загінуў у 1943 г.

**БЕЛЬСКІ Прохар Пятровіч** (1878 г.), забіты 20.1.1943 г.

**БЕЛЬСКІ Якаў Прохаравіч** (1926 г.), загінуў у канцлагеры ў Германіі.

**БУХТАРЭВІЧ Яўген Арсенцьевіч** (1928 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

**ВАЛЕЖЫК Мальвіна** (1900 г.), расстраляна 10.3.1943 г.

**ГРУШКО Аляксей** (1903 г.), забіты 10.1. 1944 г.

**ГУЗАВЕЦ Георгій Лук'янавіч** (1908 г.), забіты ў 1941 г.

**ДЗЕНІСЕВІЧ Іван Андрэевіч** (1923 г.), расстраляны 20.1.1943 г.

**ДЗЕНІСЕВІЧ Таццяна** (1908 г.), падарвалася на міне ў 1944 г.

**ДРАБІК Станіслаў Станіслававіч** (1924 г.), забіты ў 1941 г.

**ЖУКОЎСКАЯ Агрыпіна Пятроўна** (1900 г.), расстраляна 10.3.1944 г.

**ЖУКОЎСКАЯ Вікторыя** (1900 г.), спалена 22.6.1942 г.

**ЖУКОЎСКАЯ Марына Якаўлеўна** (1903 г.), расстраляна 10.2.1944 г.

**ЖУКОЎСКАЯ Наталля Осіпаўна** (1913 г.), расстраляна 1.3.1944 г.

**ЖУКОЎСКАЯ Праскоўя Рыгораўна** (1866 г.), загінула 10.3.1944 г.

**ЖУКОЎСКІ Андрэй Паўлавіч** (1872 г.), расстраляны 10.3.1944 г.

**ЖУКОЎСКІ Мікалай Аляксандравіч** (1937 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

**ЖУКОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч** (1924 г.), расстраляны ў 1943 г.

**ЖУРАВЕЛЬ Абрам** (1880 г.), спалены 22.6. 1942 г.

**ЖУРАВЕЛЬ Еўмель,** разам з жонкай і чатырма дзецьмі спалены 22.6.1942 г.

**ЖУРАВЕЛЬ Цодзік,** яго жонка і дзеці — **Борух, Гірш, Любоў, Малка** спалены 22.6. 1942 г.

**КАЛЯДА Агрыпіна Навумаўна** (1880 г.), забіта 22.2.1944 г.

**КАЛЯДА Мікалай Іванавіч** (1929 г.), расстраляны ў 1944 г.

**КАЛЯДА Пётр Сямёнавіч** (1910 г.), загінуў 24.4.1944 г.

**КАРОТКАЯ Марыя Паўлаўна** (1900 г.), расстраляна 10.3.1944 г.

**КАРОТКАЯ Сцепаніда Марцінаўна** (1904 г.), расстраляна 1.10.1944 г.

**КАРОТКІ Аляксандр Андрэевіч** (1880 г.), забіты ў 1943 г.

**КОЗІК Маісей Піліпавіч** (1884 г.), расстраляны 15.2.1944 г.

**КОЗІНЕЦ Арцём Пятровіч** (1883 г.), загінуў 1.3.1944 г.

**КОЗІНЕЦ Васіль Мяфодзьевіч,** падарваўся на міне ў 1944 г.

**КОЗІНЕЦ Дзмітрый** (1884 г.), забіты 22.2. 1944 г.

**КОЗІНЕЦ Макар Цітавіч** (1893 г.), расстраляны ў 1943 г.

**КОЗІНЕЦ Марта** (1880 г.), расстраляна 10.3. 1944 г.

**КОЗІНЕЦ Рыгор Арсенцьевіч** (1912 г.), расстраляны 1.3.1944 г.

**КОЗІНЕЦ Фядора** (1910 г.), загінула 22.6. 1943 г.

**КУЛАКОЎСКІ Мікалай Л.** (1885 г.), забіты 5.1.1944 г.

**ЛАБОВІЧ Аляксандра** (1922 г.), расстраляна 30.1.1944 г.

**МАЕР Іван Кірылавіч** (1887 г.), забіты 28.5.1944 г.

**МАЁРЧЫК Ерафей Паўлавіч** (1913 г.), падарваўся на міне ў 1944 г.

**МАЗАЙ Іван Дзмітрыевіч** (1942 г.), расстраляны 22.6.1943 г.

**МАЗАЙ Іван Іосіфавіч** (1897 г.), забіты 20.2.1944 г.

**МАЗАЙ Іван Лявонавіч** (1888 г.), забіты 20.2.1944 г.

**МАЗАЙ Ірына Фёдараўна** (1900 г.), падарвалася на міне ў 1944 г.

**МАЗАЙ Ісак Іванавіч** (1912 г.), расстраляны 20.1.1941 г.

**МАЗАЙ Маланія Яфімаўна** (1880 г.), забіта 22.6.1943 г.

**МАЗАЙ Макрына Ануфрыеўна** (1880 г.), расстраляна 22.6.1943 г.

**МАЗАЙ Сяргей Іосіфавіч** (1908 г.), расстраляны 22.6.1943 г.

**МАЗАЙ Сцяпан Архіпавіч** (1927 г.), расстраляны 25.6.1943 г.

**МАЗАЙ Якаў Паўлавіч** (1908 г.), забіты ў 1941 г.

**НІКАЛАЕНКА Іван** (1912 г.), расстраляны 20.1.1944 г.

**ПАЎЛЮЧОК Агрыпіна Якаўлеўна** (1880 г.), забіта ў чэрвені 1943 г.

**ПАЎЛЮЧОК Наталля Міхайлаўна** (1905 г.), расстраляна з дочкамі **Марыяй і Ядзвігай** 10.1. 1943 г.

**ПАЎЛЮЧОК Павел Аляксеевіч** (1880 г.), расстраляны 10.1.1943 г.

**ПАЎЛЮЧОК Хрысціна** (1918 г.), з двума дзецьмі расстраляна ў 1941 г.

**ПЕРАХОЦКІ Павел Сцяпанавіч** (1883 г.), расстраляны ў 1943 г.

**ПЛАВІНСКАЯ Ніна Андрэеўна** (1914 г.), спалена 22.6.1942 г.

**ПРАХОЦКАЯ Ануся** (1880 г.), забіта 5.1. 1944 г.

**САРОЧЫК Аўдоцця Іванаўна** (1880 г.), забіта 22.6.1943 г.

**САРОЧЫК Ганна Васільеўна,** расстраляна ў 1943 г. у Капаткевічах.

**САРОЧЫК Ганна Ігнатаўна** (1904 г.), забіта 22.7.1944 г.

**САРОЧЫК Дзяніс Юр'евіч,** расстраляны ў 1943 г. у Капаткевічах.

**САРОЧЫК Сямён Юр'евіч** (1866 г.), забіты 8.1.1944 г.

**СТАРЫНСКАЯ Марыя** (1896 г.), забіта 8.8.1944 г.

**ТРАПЕЗА Аркадзій Сяргеевіч** (1928 г.), расстраляны 30.1.1944 г.

**ТРАПЕЗА Сяргей Аркадзьевіч** (1900 г.), загінуў 30.1.1944 г.

**ХАНЧЭЎСКІ Пётр Сцяпанавіч** (1888 г.), расстраляны 1.3.1944 г.

**ХАНЧЭЎСКАЯ Ульяна Фядосаўна** (1874 г.), спалена 20.2.1944 г.

**ХАРЛАНЧУК Елізавета** (1909 г.), загінула 22.6.1942 г.

**ХАРЛАНЧУК Надзея Раманаўна** (1940 г.), спалена 22.6.1942 г.

**ХАРЛАНЧУК Наталля Паўлаўна** (1880 г.), спалена 22.6.1942 г.

**ЦЯРЭШЧАНКА Матруна Барысаўна** (1917 г.), падарвалася на міне ў 1945 г.

**ЧАУС Рыгор Міхайлавіч** (1918 г.), расстраляны 20.1.1943 г.

**ШУРПАЧ Васіль Мікітавіч** (1886 г.), забіты 4.3.1944 г.

**ШУРПАЧ Рыгор Мікалаевіч** (1870 г.), забіты 4.3.1944 г.

**ЮДЫЦКАЯ Матруна** (1890 г.), загінула 7.3. 1944 г.

**ЯСЬКОЎ Міхаіл Лявонавіч** (1880 г.), расстраляны 28.2.1942 г.

## Свята са слязамі на вачах...

Восенню 1943 г. Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі. Пачалося вызваленне рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 26 лістапада воіны Чырвонай Арміі ўвайшлі ў Гомель. Воінамі 65-й і 61-й армій 14 студзеня 1944 г. вызвалены Калінкавічы і Мазыр. Баявыя дзеянні набліжаліся да граніц Капаткевіцкага і Петрыкаўскага раёнаў. Войскі ставілі мэтай выкарыстаць маразы, каб фарсіраваць рэкі, якія былі на іх шляху. Вораг з усіх сіл імкнуўся затрымацца на гэтых натуральных рубяжах. Па даных партызан, у раёне населеных пунктаў Навасёлкі, Пціч, Вялаўск, Петрыкаў, Капцэвічы дыслацыравалася каля 7500 нямецкіх салдат.

Цяжкімі рубяжамі для нашых войск былі рэчкі Трэмля і Пціч. Маразы часта змяняліся адлігамі, лёд тонкі. Перад наступаючымі войскамі была пастаўлена задача фарсіраваць рэкі і працягваць наступленне. З 8 студзеня па 8 лютага 1944 г. працягвалася наступальная Калінкавіцка-Мазырская аперацыя войск левага крыла Беларускага фронту, якім камандаваў генерал арміі К. К. Ракасоўскі. На тэрыторыі раёна баявыя дзеянні вяла 61-я армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта П. А. Бялова, партызаны Гомельскага і Пінскага злучэнняў. У выніку аперацыі савецкія войскі прасунуліся наперад на 60 км, адкінулі ворага да р. Пціч і ў раён Петрыкава.

Каб забяспечыць адыход сваіх часцей з-пад udараў нашых войск, вораг да поўдня 28 студзеня 1944 г. упарта абараняў в. Церабаў. Аваладанне гэтага населенага пункта забяспечыла б нашым часцям падыход да ракі Пціч. Бой за Церабаў вяла 76-я гвардзейская дывізія. Нашым войскам даводзілася з вялікай крывёю адваёўваць кожны метр. Немцы ў ноч на 29 студзеня падпалілі заходнюю частку вёскі. У 13 гадз. часці дывізіі, пераадолеўшы супраціўленне ворага, авалодалі паўночна-ўсходняй часткай Церабава і да наступлення ночы працягвалі бой. 29 студзеня ў 2 гадз. першыя групы 237-га і 239-га гвардзейскіх стралковых палкоў пачалі фарсіраваць р. Трэмля, аўтаматчыкі завязалі вулічны бой. Да 6 гадз. вёска была поўнасцю ачышчана ад ворага. Часці дывізіі выйшлі на рубеж 2 км на захад ад Церабава і завязалі бой.

Аваладанне населеным пунктам Церабаў дазволіла нашым войскам ачысціць усходні бераг р. Пціч, правесці разведку абароны ворага, падыходаў да ракі і 31 студзеня пераправіцца і замацавацца на правым беразе Пцічы. 29 студзеня ўзнавіла наступленне 81-я стралковая дывізія. У выніку наступальных дзеянняў 30 студзеня сіламі 519-га стралковага палка была ўзята в. Гарадзішча, а 467-ы стралковы полк авалодаў хутарам Усочы. З наступленнем цемры 519-ы полк фарсіраваў р. Пціч на захад ад Гарадзішча і захапіў плацдарм на заходнім беразе. 1 лютага 519-ы полк выйшаў на ўсход ад Паўлаўкі. Ноччу падраздзяленні 467-га палка таксама пераправіліся на заходні бераг Пцічы.

Раніцай 2 лютага падраздзяленні двух палкоў адбілі жорсткую контратаку ворага з напрамку Паўлаўкі. На наступны дзень пасля артылерыйскай падрыхтоўкі ва ўзаемадзеянні з 15-й стралковай дывізіяй нашы войскі перайшлі ў наступленне. На працягу двух дзён, пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, часці рухаліся ў напрамку Паўлаўкі і замацаваліся ў гэтым раёне.

**Успамінае ўдзельнік баёў за в. Церабаў І. Мяняйла.** У канцы студзеня 1944 г. камандзір батальёна маёр Усцінаў даручыў камандзіру кулямётнай роты старшаму лейтэнанту П. Лакціёнаву перасекчы дарогу Церабаў – Капаткевічы і пры адыходзе гітлераўцаў закупорыць яе паміж непраходнымі балотамі.

— З Церабава да ракі Пціч адна дарога, дзе вы зробіце засаду. Будзьце гатовы сустрэць праціўніка. Лакціёнаў загадаў акапацца. У мокрым снезе гэта было вельмі нялёгка. З боку Церабава чулася

бесперапынная страляніна. І вось у туманнай імгле паказаліся постаці ворагаў. Кулямётчыкі першымі адкрылі агонь. Лейтэнант Д. Парашчын кіраваў боем на другім баку дарогі. Многія гітлераўцы адваяваліся ў тую раніцу на лясной дарозе ля Церабава.

Праз некаторы час ля раз'езда Малашэвічы загінуў старшы лейтэнант Лакціёнаў. Яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У лютым войскі 61-й арміі адбівалі контратакі ворага, якія імкнуўся вярнуць страчаныя пазіцыі, праводзілі частковую перагрупіроўку войск, падцягвалі артылерыю, папаўнялі боезапас, вялі глыбокую разведку абароны ворага. 55-я стралковая дывізія атрымала загад перабазіравацца з раёна Церабава і заняць абарону на рубяжы Скрыгалаў — Убарцкая Рудня. Праведзена перадыслакацыя і другіх падраздзяленняў. На 5 лютага істотных змяненняў лініі фронту не адбылося. Камандуючы 1-м Беларускім фронтам К. К. Ракасоўскі ў кнізе «Солдатский долг» пісаў:

«6 февраля положение на фронте не изменилось, и лишь 7 февраля 415-я стрелковая дивизия, наступая в общем направлении Ивашковичи, овладела д. Павловка и вела бой в 1 км северо-западнее. Остальные части дивизии находились на прежних рубежах.

8 февраля 23-я стрелковая дивизия с 3.00 продолжала наступление с задачей овладеть д. Колки, которая превращена противником в опорный пункт с круговой обороной, удерживаемый подразделениями 4-й танковой дивизии. Под сильным огнем противника 225-й и 117-й стрелковые полки переправились на западный берег р. Тремля и ворвались на юго-западную окраину Колок. Противник... силами до роты пехоты с двумя танками, 4 бронетранспортерами с пехотой контратаковал подразделения 225-го стрелкового полка и потеснил в рощу, что 1,5 км юго-западнее Колок. Переправа 89-го стрелкового полка на западный берег р. Тремля сдерживалась сильным огнем противника из района д. Колки».

19 лютага 89-ы стралковы корпус на працягу ночы вёў падрыхтоўку да наступлення. У 9 гадз. 30 мін сіламі 15-й і 23-й стралковых дывізій перайшоў у наступленне з задачай авалодаць в. Колкі. Воіны 15-й дывізіі, наступаючы з рубяжа Вострава, Загрэўкі, сутыкнуліся з моцным супраціўленнем ворага. Адбіўшы тры контратакі ворага, завязалі бой на паўночны ўсход ад в. Колкі. Лыжны батальён атрымаў загад выйсці ў тыл ворага і злучыцца з партызанамі. Лыжнікі былі спынены моцным агнём ворага і ўступілі ў бой каля в. Зублішча. 23-я дывізія мела задачу авалодаць в. Колкі з поўдня і вяла бой у 2 км ад вёскі.

Не змяніўся характар баявых дзеянняў і 20 лютага. Лыжны батальён, абышоўшы в. Зублішча, выйшаў у Белае Балота (у 5 км ад Лучыц) і злучыўся з партызанамі для сумеснага наступлення. Раніцай 21 лютага батальён і партызаны былі сустрэты моцным агнём і контратакаваны, наступленне поспеху не мела, воіны вымушаны былі адысці. 22 лютага войскі арміі спынілі наступальныя дзеянні на правым флангу і прыступілі да абароны і ўмацавання займаемага рубяжа, вялі разведку. 25 лютага ў адпаведнасці з дырэктывай Стаўкі 61-я армія ўвайшла ў састаў войск 2-га Беларускага фронту. Напрамак наступлення яе быў ранейшым.

Штодзень ішлі крывапралітныя, беспаспяховыя баі. Чырвоная Армія выдыхалася, без падтрымкі артылерыі, танкаў, якія адсталі ад перадавых часцей, наступленне ў тыя студзеньскія і лютаўскія дні наогул уяўлялася бесперспектыўным, але паступала каманда: «Наперад...». На высокім заходнім беразе Пцічы праціўнік замацаваўся на загадзя падрыхтаваных пазіцыях, мясцовасць была цяжкапраходнай, балоцістай. Фронт «забуксаваў» тут амаль на доўгіх паўгода.

У сакавіку была праведзена перагрупіроўка падраздзяленняў, вялося ўмацаванне абароны, папаўненне боеприпасамі. Лінія фронту складалася з дзвюх палос. Першую трымаў 89-ы стралковы корпус, 55-я і 23-я дывізіі. Другую паласу займаў 9-ы гвардзейскі стралковы корпус, 2-і кавалерыйскі корпус быў у рэзерве.

У другой палавіне сакавіка войскі 61-й арміі сіламі 55-й стралковай дывізіі вялі паспяховыя наступальныя баі па ачышчэнню ад ворага паўднёвага берага р. Прыпяць на ўчастку Багрымавічы — Убарцкая Рудня. Часці Чырвонай Арміі праводзілі перагрупіроўку, рыхтаваліся да наступлення. Лінія абароны заставалася амаль без змен у канцы сакавіка і ў красавіку.

У чэрвені 1944 г. у час падрыхтоўкі Беларускай наступальнай аперацыі ў састаў 1-га Беларускага фронту была ўключана 28-я армія, якая заняла лінію абароны на тэрыторыі Капаткевіцкага раёна. У задачу яе ўваходзіла не дапусціць прарыву пяхоты і танкаў ворага, а таксама перакрыць напрамкі на Колкі, Белы Бераг, Жукаўка, Першая Слабодка, Залессе.

Баявая дзейнасць праціўніка насіла характар абароны на шырокім фронце. На ўчастку Капаткевічы — Багрымавічы на заходнім беразе р. Пціч апорнымі пунктамі і вузламі супраціўлення ворага з'яўляліся Капаткевічы, Івашкавічы, Пціч, Багрымавічы. Пярэдні край меў тры лініі траншэй з добра арганізаванай сістэмай агню, з дротавымі агароджамі і міннымі палямі.

Войскі 55-й дывізіі, якой камандаваў палкоўнік М. А. Андрусенка, правялі перагрупіроўку сіл. Вялася сістэматычная разведка абароны ворага. Старшы сяржант Курдзюкоў з групай разведчыкаў неаднаразова пранікаў у тыл ворага ў раёне Багрымавіч і Конкавіч, знаходзіўся там па 3—4 сутак і прыносіў каштоўныя звесткі аб ворагу.

27 чэрвеня раніцай на камандны пункт 55-й дывізіі з'явіліся камандзір 89-га стралковага корпуса генерал-маёр Яноўскі, камандзір Дняпроўскай ваеннай флатыліі капітан першага рангу Грыгор'еў і камандзір 2-й брыгады рачных катэраў капітан другога рангу Міцін. Камандзіру 55-й дывізіі была пастаўлена задача ва ўзаемадзеянні з 2-й брыгадай рачных катэраў наступаць у паўночна-заходнім напрамку і фарсіраваць р. Прыпяць. Бліжэйшая задача — авалодаць апорным пунктам немцаў у г. Петрыкаў. Гатоўнасць да пачатку аперацыі — 6.00 28 чэрвеня. Сігнал «Дуб» на наступленне быў дадзены ў 17.00.

Пасля атрымання сігналу на наступленне бранякатэры пад прыкрыццём агню дывізіённай артылерыі высадзілі на левы бераг Прыпяці групу разведчыкаў 107-га палка і атрад маракоў у складзе звыш 50 чалавек. Дэсантнікі ўклініліся ў абарону ворага, захапілі плацдарм і двух палонных, якія далі каштоўныя звесткі аб абароне праціўніка. Яны сказалі, што салдатам загадана абараняцца да апошняга...

Камандуючы 61-й арміяй паставіў задачу перад 55-й дывізіяй у раёне Скрыгалава, перад 23-й стралковай дывізіяй у раёне Турава пачаць наступленне ў напрамку Жыткавіч. З войскамі 61-й арміі дзейнічала 2-я брыгада караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі пад камандаваннем капітана першага рангу В. Грыгор'ева. Аперацыю падтрымлівалі лётчыкі 16-й паветранай арміі генерал-лейтэнанта С. Рудэнкі. Прарыў абароны на Петрыкаўскім напрамку пачаўся 28 чэрвеня ў 17 гадзін 30 мінут ніжэй в. Конкавічы. Дэсант на левы бераг Прыпяці высадзілі маракі-дняпроўцы. Пры дапамозе катэраў флатыліі пад шалёным агнём ворага пачаў фарсіраваць Прыпяць першы батальён 107-га палка пад камандаваннем капітана В. Турчанінава. На левы бераг Прыпяці на катэрах быў перапраўлены 111-й




Камень у Дарашэвіцкім парку, устаноўлены ў 1947 г. у гонар вызвалення раёна

полк, які заняў плацдарм у раёне вв. Конкавічы і Навасёлкі. Конкавічы былі вызвалены апоўдні 29 чэрвеня. Паспяховае наступленне стралковых палкоў і маракоў Дняпроўскай флатыліі прымусіла ворага пакінуць ст. Пціч.

У гэтых баях нязгаснай славай пакрыў сябе малодшы лейтэнант М. П. Чалы. Ён камандаваў галаўным атрадам флатыліі, удзельнічаў каля Петрыкава ў чатырох дэсантных аперацыях. Дэсантнікі пераадолелі дротавыя ўмацаванні і міннае поле, выявілі размяшчэнне варожых пазіцый, авалодалі вузлом абароны праціўніка ў в. Конкавічы, садзейнічаючы паспяховаму наступленню падраздзяленняў Чырвонай Арміі на Петрыкаў. М. П. Чалы загінуў 1 ліпеня ў баі каля в. Дарашэвічы.

Караблі флатыліі пачалі перапраўляць на захоплены плацдарм 1-ы батальён 107-га палка пад камандаваннем капітана Турчанінава. Воіны імкліва наступалі ў напрамку Конкавіч па цяжкапраходнай балоцістай мясцовасці. Іншыя падраздзяленні 107-га палка знішчылі прадмосны плацдарм праціўніка каля Шастовіч і Вялаўска і прыступілі да фарсіравання Прыпяці на поўдзень ад Навасёлак. У гэтым крывапралітным баі асабліва вызначыліся воіны 2-га батальёна пад камандаваннем капітана Нізаўца. Падраздзяленні 111-га і 228-га палкоў пераадолелі ўмацаванні ворага на правым беразе Прыпяці на поўдні ад Петрыкава і пад покрывам ночы пачалі фарсіраваць раку. Войскі атрымалі загад раніцай 28 чэрвеня авалодаць г. Петрыкаў.

Пры праследаванні ворага ў бліндажы каля в. Гараваха былі знойдзены дакументы каманднага пункта 102-й нямецкай пяхотнай дывізіі і схема абароны ворага. Гэта значна аблегчыла задачу наступаючых войск. На ўчастку фронту па ўсходнім беразе р. Пціч на тэрыторыі Капаткевіцкага раёна ад в. Дземенка да вусця ракі часці войск вялі разведку, рыхтавалі пераправу праз раку.

У выніку паспяховых наступальных дзеянняў 55-й стралковай дывізіі і часцей 28-й арміі ў напрамку Слуцк — Баранавічы вораг, каб не трапіць у акружэнне, вымушаны быў паспешна адысці, пакінуўшы ўмацаваны рубеж абароны па заходнім беразе р. Пціч. Баі ішлі надзвычай цяжкія і крывапралітныя, у балоцістай, цяжкапраходнай мясцовасці. Ворагі абараняліся з упартасцю асуджаных. Задача па авалоданні Петрыкавам была выканана толькі 30 чэрвеня. У 23.30 у горад увайшлі часці Чырвонай Арміі.

2 ліпеня войскі 55-й Мазырскай стралковай дывізіі з баямі падышлі да в. Брынёў. Вораг аказаў моцнае супраціўленне. З п. Капцэвічы немцы кідалі аўтаматчыкаў пры падтрымцы танкаў і самаходных гармат, спрабуючы абысці 107-ы полк. У гэтых баях зноў вызначыўся першы батальён пад камандаваннем капітана Турчанінава. Амаль акружаны, ён знішчыў да роты аўтаматчыкаў, самаходную гармату, танк, некалькі павозак ворага. Правы фланг дывізіі быў узмоцнены асобным знішчальна-супрацьтанкавым дывізіёнам і групай разведчыкаў з разведроты дывізіі пад камандаваннем капітана Зіміна, які быў цяжка паранены. У 5 гадз. 3 ліпеня часці дывізіі авалодалі Брынёвам.

Загадам камандзіра дывізіі камандзір асобнай зенітнай роты старшы лейтэнант Барысаў быў прызначаны камендантам г. Петрыкаў. У яго задачу ўваходзіла арганізацыя абароны горада, прыкрыццё дзеянняў дывізіі з тылу, падтрымка парадку ў горадзе, арганізацыя мірнага жыцця насельніцтва.

Войскі 55-й Мазырскай стралковай дывізіі працягвалі наступленне і вызваленне раёна ад акупантаў. Бліжэйшай баявой задачай было авалоданне сіламі 107-га палка чыгуначнай станцыяй Старушкі. 111-ы полк праследаваў праціўніка ў напрамку Гараваха — паўночная ўскраіна Брынёва. 228-ы полк знаходзіўся ў рэзерве. 2-я брыгада рачных катэраў з вучэбнай ротай і ад-

дзяленнем сапёраў пад камандай капітана Андрэева атрымала загад дэсантнымі дзеяннямі авалодаць в. Дарашэвічы і прыкрываць дывізію злева. Задача была паспяхова выканана, у выніку ўвесь раён ачышчаны ад ворага. Шлях ляжаў далей, на захад, дзе з вялікім нецярпеннем чакалі збаўлення змучаныя гадамі няволі савецкія людзі.

*А. В. Бічан*

## ИЗ ПРИКАЗА КОМАНДИРУ 415-й СТРЕЛКОВОЙ ДИВИЗИИ

Противник из района Калинковичи — Мозырь отходит в западном и северо-западном направлении... К исходу 15.1.44 переправиться через р. Припять на участке устье р. Птичь — м. Скрыгалов и головными частями овладеть м. Птичь, Конковичи. 55-я стрелковая дивизия преследует отходящего противника вдоль железной дороги Калинковичи — ст. Птичь.

Боевое распоряжение командиру 2-го гвардейского кавалерийского корпуса.

2-му гвардейскому кавалерийскому корпусу продолжать наступление. Задача — к утру 15.1.44 г. овладеть населенными пунктами Кацуры, Млынок, Беседки и, удерживая район, не допустить отход противника с востока на м. Птичь. В дальнейшем наступать в направлении на Копаткевичи, Лучицы.

## БОЕВОЕ ДОНЕСЕНИЕ О ПОЛОЖЕНИИ ЧАСТЕЙ 61-й АРМИИ

16.1.44 к 20.00 части занимают следующий рубеж: 2-й гвардейский кавалерийский корпус вел упорный бой за овладение деревнями Беседки, Багримовичи. Встретив организованное огневое сопротивление противника, успеха не имел. 17-я гвардейская кавалерийская дивизия — Беседки, отм. 1208, юго-восточная окр. Багримовичи.

Несмотря на первые неудачи, войска согласно приказу командования должны очистить от противника бассейны рек Тремля и Птичь.

18 и 19 января войска армии вели наступательные бои, встретив сильное огневое сопротивление и контратаки противника, успеха в продвижении не имели.

*Белов*

## ИЗ ОТЧЕТА О БОЕВЫХ ДЕЙСТВИЯХ 61-й АРМИИ

Войска правого фланга и центра армии продолжали преследование противника и продвинулись вперед от 4 до 9 км, овладели населенными пунктами Теребов, Городище, Хусное, Кацуры, Беседки. На участке Городище — Багримовичи вышли на восточный берег р. Птичь.

9-й гвардейский стрелковый корпус к 11.00 очистил от противника Теребов и к исходу дня продвинулся до 6 км.

89-й корпус, преследуя отходящего противника, продвинулся вперед до 9 км и вышел на восточный берег р. Птичь.

15-я дивизия занимает рубеж Городище — Хусное. 356-я стрелковая дивизия — восточный берег р. Птичь на участке Хусное — хутор Горки.

415-я дивизия в результате ночного боя овладела населенными пунктами Кацуры, Беседки и к исходу дня вышла на восточный берег р. Птичь. Один полк форсировал р. Птичь и ведет бой на восточной окраине д. Багримовичи.

30 января 89-й корпус к 23.00 под сильным огнем противника начал форсирование р. Птичь.

81-я дивизия переправила на западный берег реки стрелковый полк в районе отм. 119,9 800 м северо-западнее Городища (остальные части продолжают форсирование реки).

15-я дивизия форсировала к 19.00 р. Птичь юго-западнее Городища. Ведет бой за расширение плацдарма.

356-я дивизия к 17.00 форсировала р. Птичь на участке Хусное — хутор Горка и ведет бой за расширение плацдарма на западном берегу реки.

415-я дивизия с утра перешла в наступление с задачей: блокируя Багримовичи с севера, совместно с частями 356-й дивизии выйти к южной окраине м. Птичь и овладеть последним. Встретив сильное огневое сопротивление противника, успеха не имела. Ведет бой на прежнем рубеже.

17-я гвардейская кавалерийская дивизия вышла к южному берегу р. Припять в 3 км севернее Скрыгалова.

Главные силы а́рмии вышли к р. Птичь.

## ИТОГИ БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ПАРТИЗАН ПЕРЕД ФРОНТОМ 61-й АРМИИ ЗА ЯНВАРЬ 1944 г.

...Партизанам в январе 1944 г. пришлось вести бой с противником по р. Птичь, где противник решил занять оборону и вытеснить партизан:

а) с 5.1.44 г. противник ввел свои гарнизоны в ряд деревень партизанской зоны северо-западнее Копаткевич;

б) в ночь на 8.1.44 г. партизаны в составе двух бригад напали на немецкие гарнизоны в деревнях Копцевичи... Филиповичи, Новоселки, выбили их, уничтожив при этом более 140 солдат и 9 офицеров противника;

в) 8.1.44 г. противник силой до батальона повел наступление из д. Михедовичи на д. Бобрик, занятую партизанами. Отряды бригады Скалобана вели бой в течение 5 ч 30 мин. Противник поджег деревню и с потерями отошел;

г) 18.1.44 г. противник, стремясь занять западный берег р. Птичь севернее д. Копцевичи, овладел д. Кашевичи, Н. Головчицы;

д) 21.1.44 г. после продолжительного боя немцы заняли Проходы, Ст. Головчицы, Белый Переезд, Лучицы.

## ИЗ ЖУРНАЛА БОЕВЫХ ДЕЙСТВИЙ 61-й АРМИИ ЗА МАРТ 1944 г.

13 марта войска 55-й дивизии преследовали отходящего противника, усиленно минировавшего пути отхода на участке Балажевичи — Сколодин, заняли 15 населенных пунктов и продвинулись вглубь от 2 до 6 км.

55-я дивизия к 20.00 вышла на рубеж:

107-й стрелковый полк — западнее Балажевич на опушке леса, восточнее Шестович;

111-й стрелковый полк: Шестовичи, восточный берег озера Глиницкое, Глиница;

228-й стрелковый полк: Глиница, хутор Сколодинская Гряда, Убортская Рудня...

14 марта. Противник на участке Балажевичи — Петриков продолжал отход в северном и северо-западном направлении, прикрываясь огнем орудий и минируя пути отхода... 107-й стрелковый полк вышел на рубеж отм. 115,9 (западнее Балажевич);

111-й стрелковый полк — Шестовичи, Велавск;

228-й стрелковый полк — отм. 120,8 (3 км юго-западнее Велавска).

Дивизия ведет усиленную разведку в направлении Снядина.

23-я дивизия, обороняя прежний рубеж, ведет разведку в направлении д. Мордвин. Весь район населенного пункта минирован...

15 марта. Противник на участке Балажевичи — Петриков отвел основные силы на северный берег р. Припять. Продолжают оказывать сопротивление мелкие группы автоматчиков северо-восточнее Мойсеевич.

Части дивизии вели разведку и бой с противником. Встретив сплошные минные поля, лесные завалы, части продвинулись вперед и заняли х. Черноцкие, д. Мойсеевичи и вышли на рубеж:

107-й стрелковый полк — отм. 115,9 (западнее д. Балажевичи) — ур. Замостовье;

117-й стрелковый полк — 700 м севернее д. Шестовичи, х. Черноцкие...

16 марта. ...Частью сил 55-я и 23-я стрелковые дивизии перешли в наступление в направлениях дд. Снядин, Белин... Разведгруппы 55-й стрелковой дивизии полностью очистили от противника южный берег р. Припять на участке Балажевичи — Петриков.

356-я дивизия обороняет прежний рубеж, ведет разведку в направлении м. Птичь.

55-я дивизия силами 107-го и 111-го стрелковых полков обороняет прежний рубеж;

228-й стрелковый полк двумя стрелковыми и минометной ротой, переправившимися через р. Уборть, занял хх. Мордвин, Набедра, Долгие, ведет разведку в направлении Белина, Снядина.

20 марта. На петриковском направлении к исходу 20.03.44 г. противник удерживает рубеж: Колки, Броды, Копаткевичи, Птичь, Багримовичи, северный берег р. Припять до Петрикова...

1 апреля. Противник обороняется против правого крыла армии на рубеже: Михайловская, Колки, Копаткевичи, Млынок, Птичь, Багримовичи, Конковичи, Белановичи, Петриков, Голубица, Дорошевичи, Лясковичи...

В апреле армия наступательных действий не вела. С 15 апреля директивой Ставки войскам фронта было приказано перейти к обороне. Войска проводили частичную перегруппировку сил в целях перехода к жесткой и прочной обороне на широком фронте, продолжали укреплять прежний рубеж, вели разведку и перестрелку с противником, очищали от снега дороги, так как были снежные заносы. Непосредственная боевая деятельность войск ограничивалась отражением попыток противника к ведению разведки наших боевых порядков и ведением активной разведки противника...

...В апреле в состав 61-й армии прибыла бригада Днепровской военной флотилии под командованием капитана 1-го ранга Григорьева.

В мае войска армии продолжали оборонять прежние рубежи, производили оборонительные работы по усовершенствованию занимаемых позиций, вели перестрелку с противником. Противник вел редкий артиллерийско-минометный огонь из районов Багримовичи, Петриков...

## ЗАДАЧА 55-й СТРЕЛКОВОЙ ДИВИЗИИ НА НАСТУПЛЕНИЕ И ОСВОБОЖДЕНИЕ г. ПЕТРИКОВ

...Наступать в западном направлении, боевой порядок дивизии — три полка в линии, главный удар — левым флангом двумя полками в направлении г. Петриков. Правым флангом наступать во взаимодействии со 2-й бригадой речных катеров вдоль левого берега р. Припять, дав возможность подхода кораблям бригады к району г. Петриков для совместного действия с частями дивизии. Готовность к наступлению 6.00 28 июня, начало боевых действий по сигналу «Дуб»...

107-й стрелковый полк во взаимодействии со 2-й бригадой речных катеров... форсировать р. Припять и овладеть д. Конковичи, в дальнейшем наступать вдоль левого берега Припяти и обеспечить подход бронекатеров бригады к г. Петриков, для чего на бронекатерах высадить десант силой до батальона на левый берег Припяти северо-восточнее д. Скрыгалов, остальными силами полка уничтожить плацдарм противника севернее Велавска и далее форсировать Припять южнее Новоселок. Особое внимание уделить своему правому флангу.

111-му стрелковому полку форсировать Припять южнее д. Белка, наступать в направлении на восточную окраину д. Белка и во взаимодействии с 228-м стрелковым полком овладеть г. Петриков обходом его с севера, в дальнейшем наступать вдоль шоссе на Гороваху...

228-му стрелковому полку форсировать р. Припять в районе отм. 121,1, наступать на западную окраину г. Петриков с задачей во взаимодействии со 111-м стрелковым полком овладеть городом, обойдя с запада.

Командиру 2-й бригады речных катеров взаимодействовать с 107-м стрелковым полком, обеспечить высадку десанта силой до батальона на левый берег Припяти в районе северо-восточнее Скрыгалова и при поддержке артиллерийского огня бригады и катеров очистить левый берег реки от противника, подойти к г. Петриков и во взаимодействии со 111-м и 228-м полками овладеть городом; обеспечить переправу на левый берег р. Припять в районе южнее Новоселок артиллерии, штаба дивизии, обозов...

111-й и 228-й стрелковые полки, форсировав реку, оказались в болотистой местности, ввиду сильного огня противника продвигаться дальше не могли и в течение 29 июня и с утра 30 июня овладеть городом не могли...

Ввиду успешного продвижения 107-го полка часть артиллерии и штаб дивизии на плавсредствах бригады речных катеров в районе Новоселок были переправлены на левый берег реки. КП дивизии в 11.00 30 июня был развернут в Новоселках.

В 13.00 командир дивизии отдал приказ:

а) 107-му полку прикрывать действия частей дивизии справа;

б) 111-му полку на бронекатерах и плавсредствах бригады достичь д. Новоселки, высадиться на левый берег реки и наступать на Петриков обходом города с севера;

в) 228-му полку сковать противника в районе Петрикова и совместно со 111-м полком ворваться в город...

## КРАТКАЯ СПРАВКА О БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ 161-го УКРЕПРАЙОНА

В 3.00 ч 3 июля 44 г. форсирована р. Птичь в районе д. Хвойня. Противник преследовался в направлении Кашевичи, Новые Головчицы, Комаровичи... За 4 дня боевых действий части укрепрайона, ведя наступательные действия по преследованию противника в направлении дд. Хвойня, Кашевичи, Новые Головчицы, заняли 310 населенных пунктов, среди которых: Поречье, Кашевичи, Германова Слобода, Головчицы, Комаровичи... Построено мостов длиной от 4 до 10 м — 25, отремонтировано дорог — 29 км, построено объездных дорог — 110 км, снято противотанковых мин — 1025, противопехотных мин — 795, построено паромных переправ через р. Птичь — 3, мостов через Птичь длиной 70 м — 1.

## БОЕВОЕ ДОНЕСЕНИЕ 1 июля 1944 г.

Перед фронтом обороны противника нет. Подразделения батальона вели наблюдение и службу по охране рубежа на переднем участке обороны. Производилось огораживание минных полей. В 15.00 возвратилась часть разведгруппы, которая прошла по маршруту Рог — Акрыёны — ст. Коржевка — Млынок — Хусное. Противника не обнаружено. Между дд. Рог и Акрыёны взорваны все мосты (13 шт.).

Части 119-го УР, не встретив противника, 4 июля 1944 г. прошли населенные пункты Птичь, Конковичи, Мицуры, Слинки, Коржевка, Сметаничи. 5 июля 44 г. 415-й ОПАБ головной колонной прошел к 12.00 Оголичскую Рудню и к вечеру достиг выс. 134,2. 370-й ОПАБ, достигнув рубежа Жердь, преследовал противника по направлению Рябка — Б. Селютичи. 6.07.44 г. части 119-го УР прошли Копцевичи и продолжали движение по маршруту в направлении Бринёва.

ЦАМО РФ, ф. 55-й СД, оп. 1, д. 22; ф. 119, оп. 1, д. 1; ф. 418, оп. 106, д. 373; ф. 1077, оп. 2, д. 49.

## ИЗ СООБЩЕНИЙ СОВЕТСКОГО ИНФОРМБЮРО

30 июня 1944 г.

В районе среднего течения реки Припять наши войска вели наступательные бои, в ходе которых овладели районными центрами Полесской области городом Петриков, городом Копаткевичи, а также заняли более 20 других населенных пунктов, в том числе Кошевичи, Челющевичи, Ивашковичи, Конковичи, Белановичи и железнодорожные станции Секеричи, Птичь...

5 июля 1944 г.

...К западу от города Мозырь наши войска заняли более 30 населенных пунктов, среди которых крупные населенные пункты Германова Слобода, Новоселки, Бобрик, Михедовичи, Копцевичи, Бринёв, Дорошевичи, Лясковичи..., а также железнодорожные станции Муляровка, Копцевичи.

## Чырвоны сцяг над Петрыкавам

**З успамінаў былога начальніка палітаддзела 55-й Мазырскай стралковай дывізіі палкоўніка М. Б. Івушкіна**

У кнізе «Гісторыя другой сусветнай вайны» генерал Курт Ціпельскірх піcaў: «За кошт значнага агалення раней займаемых пазіцый, а таксама з дапамогай дзвюх дывізій, знятых з іншых участкаў фронту, 2-я армія стварыла абарону на шырокім фронце ад Петрыкава да шашы Брэст — Ковель уключна»... Наступаючыя часці Чырвонай Арміі не змаглі з ходу прарваць абарону ворага.

15 лютага камандзір 55-й дывізіі палкоўнік Андрусенка і я накіраваліся ў 2-і кавалерыйскі корпус. Дывізія атрымала загад прыняць паласу абароны, якую да гэтага займаў корпус у раёне Скрыгалаў — Убарцкая Рудня. Абарона праціўніка перад фронтам дывізіі праходзіла па паўночным беразе р. Прыпяць і яе прытоку Убарці. На правым беразе Прыпяці, на паўднёвы захад ад Конкавіч, каля Навасёлак і Петрыкава гітлераўцы трымалі перадмоставыя ўмацаванні. Частка мясцовасці ў паласе абароны праціўніка была забалочана, пакрыта чаротам і хмызняком. Па берагах фашысты выкапалі тры лініі траншэй поўнага профілю, на подступах да іх устанавілі дротавыя перашкоды і мінныя палі.

Член Ваеннага савета арміі генерал-маёр Дуброўскі рэзка крытыкаваў камандзіра дывізіі за дрэнную арганізацыю разведкі. Гэтая задача была даручана начальніку штаба палкоўніку Шмыглёву і мне. Пачалі рыхтаваць групу пошуку. Яе ўзначаліў капітан Зімін. У групу ўвайшлі лепшыя разведчыкі — сяржанты Патрыкееў, Перацягін, Скуратаў і іншыя. 21 мая ўдалося захапіць унтэр-афіцэра, казначэя аднаго з батальёнаў 102-й пяхотнай дывізіі, які даў каштоўныя паказанні.

У красавіку па Прыпяці падышлі

караблі Дняпроўскай ваеннай флатыліі з задачай прыкрыцця стыку нашай дывізіі і 119-га ўкрэпраёна. Першыя сумесныя баявыя дзеянні былі праведзены ў ноч на 23 красавіка. З мэтай разведкі абароны праціўніка на паўночным беразе Прыпяці ў раёне в. Багрымавічы на чатырох катэрах і трох паўглісерах, якімі камандаваў капітан трэцяга рангу Пяскоў, высаджаны дэсант у складзе 56 чалавек. Дэсантнікі, падтрымліваемыя агнём катэраў, правялі разведку боем, выявілі абарону праціўніка. Нам стала вядома аб перагрупоўцы часцей ворага, удакладнена схема размяшчэння агнявых сродкаў. Перад фронтам дывізіі стаялі злучэнні і часці 2-й нямецкай арміі – 102-я пяхотная дывізія, 11-я дывізійная група «Кнот», 114-ы сапёрна-будаўнічы батальён і пяць дывізіёнаў артылерыі.

25 чэрвеня наша дывізія атрымала баявы загад: ва ўзаемадзеянні з 2-й брыгадай рачных караблёў флатыліі прарваць абарону на левым беразе Прыпяці, авалодаць населенымі пунктамі Конкавічы, Аціркі, Навасёлкі і горадам Петрыкаў. На падрыхтоўку да наступлення адводзілася тры дні. Першым павінен быў фарсіраваць Прыпяць 107-ы полк. Камандзір палка падпалкоўнік Смякалін рашыў нанесці галоўны удар сіламі 1-га і 2-га батальёнаў. Энергічны і ініцыятыўны камандзір 1-га батальёна старшы лейтэнант Турчанінаў пачаў дзейна рыхтавацца да наступлення. Вось як былі апісаны дзеянні турчанінаўскага батальёна ў адным з газетных артыкулаў у 1944 г.

...«Гарачае сонца, цішыня на фронце. Спакойна цякуць няхуткія воды Прыпяці. Паўднёвы бераг – наш, паўночны – у руках немцаў. Відны пустынныя вуліцы сяленняў на занятым ворагам беразе. Плёскае рыба ў рацэ...

Пяць-шэсць мін, дзве-тры чаргі з кулямёта за дзень, панылы гук усім надакучыўшай «рамы» – вось і ўсё, што нагадвае аб вайне. У салдат ёсць час, каб напісаць пісьмо, пачытаць газету, нават паглядзець кінафільм у старым хляве ў паўкіламетры ад нямецкай пазіцыі.

І ўсё-такі ўсім надакучыла цішыня. Хочацца хутчэй у бой, у наступленне, бо ўсе ведаюць, што там, за ракой, фашысты робяць злачынствы, штодзённа гінуць савецкія людзі...»

180 метраў воднай прасторы, якія трэба было пераадолець, маглі ператварыцца ў зону смерці. Доўгія месяцы абароны немцы выкарысталі не дарма, паспелі як след умацавацца... Ноччу на лодцы адплылі разведчыкі малодшага лейтэнанта Сабліна, з імі чацвёра сапёраў. Яны вярнуліся раніцай, мокрыя і стомленыя, расказалі аб размяшчэнні нямецкіх батарэй, дзотаў, траншэй і, галоўнае, аб тым, што ім удалося перабрацца праз непраходнае, як думалі ўсе, і таму неабараняемае балота на правым флангу немцаў.

Наступнай ноччу да берага падышлі чатыры бранякатэры. На першы з іх узышлі разведчыкі і стралкі малодшага лейтэнанта Карабіцына.

І вось першы катэр аддаў швартовы. Ён не мог прыстаць да супрацьлеглага берага, нельга было дапусціць, каб яго заўважылі немцы... Прыпяць у гэтых месцах глыбокая, але матросы ведалі водмель, па якой можна было дайсці ўброд да берага. Яна пачыналася амаль з сярэдзіны ракі. Да яе падышоў катэр. Трымаючы зброю над галавой, людзі ішлі па пояс і па грудзі ў вадзе. Дваццаць чалавек высадзіліся на чале з малодшым лейтэнантам Сабліным. Ад дзеянняў гэтай невялічкай групы залежаў поспех бою. Стаяла задача: выйсці праз балота ў тыл і нечакана ўдарыць, пасеяць паніку ў стане ворага.

І вось цішыня раскалолася, у перадсвітальнае неба ўзвіліся дзесяткі ракет. Загрукатала нямецкая артылерыя, ёй пачала адказваць наша.

Катэры з дэсантам немцы заўважылі на сярэдзіне ракі. На іх абрушыўся шквал агню. У адказ катэры ўдарылі з гармат, адкрылі агонь артылерысты з нашага берага. Два другія катэры кінуліся на выручку, падышлі амаль ушчыльную да нямецкага берага і пачалі біць прамой наводкай. Пад прыкрыццём іх агню частка дэсанта паспела высадзіцца, але замацавацца было вельмі цяжка.

Саблін з дзесяткам байцоў атакаваў нямецкі дзот, Курдзюкоў кінуў у дзверы дзве гранаты. Некалькі чырвонаармейцаў пад камандаваннем Карабіцына ўварваліся ў траншэю і ачысцілі ад ворагаў яе значную частку. Аднак немцы хутка апамяталіся і атакавалі дэсантнікаў. Бой быў няроўным, вораг насядаў. Здавалася, выхаду няма. Ма-

ракі пайшлі ў контратаку ў бесказырках, у паласатых цяльняшках, прама пад шквальны агонь ворага... Адчайны штурм варожых умацаванняў маракамі акрыліў пехацінцаў, яны ўзмацнілі націск, фашысты пабеглі... У іх адчувалася разгубленасць і паніка, агонь гармат слабеў. З берага данеслася «ўра». Хутка першая траншэя нямецкай абароны была ў нашых руках. Пасля бою капітан Турчанінаў аб'явіў падзяку за мужнасць малодшым лейтэнантам Сабліну і Карабіцыну, а яны дзякавалі маракам. Іх было пятнаццаць, але сваім націскам яны замянілі добрую роту...

Хутка батальён пераправіўся на катэрах на другі бераг Прыпяці. Рухаліся з баямі па балоцістай мясцовасці. Пасля цяжкага бою чырвонаармейцы занялі важны апорны пункт ворага — в. Конкавічы. Астатнімі сіламі 107-ы полк ліквідаваў перадмостны плацдарм ворага на поўначы ад Шастовіч і Вялаўска.

Паспяхова дзейнічаў пад камандаваннем старшага лейтэнанта Нізаўца 2-і батальён. Ён фарсіраваў раку ў раёне в. Навасёлкі і таксама захапіў плацдарм. Сюды адразу была перакінута на катэрах артылерыя дывізіі, сапёрны батальён пачаў наводзіць пераправу праз Прыпяць. 111-ы і 228-ы палкі вялі баі ў перадмостных умацаваннях ворага на правым беразе ракі, на поўдзень і паўднёвы ўсход ад Петрыкава.

Раніца. Насцярожаная цішыня. Прыглушаныя каманды. Узвод малодшага лейтэнанта Бектыбаева сканцэнтраваўся на зыходнай пазіцыі. Паўзком прабіраючыся па адкрытых месцах, па купінах балота, байцы набліжаліся да вышыні. Немцы заўважылі іх і адкрылі агонь. Паветра напоўнілася выццём мін, грукатам снарадаў, трэскам кулямётаў.

Наперадзе цягнулі кулямёт азербайджанец Азіз Аліеў і яго таварышы. Яны прыкрывалі ўзвод агнём. Вакол рваліся міны і снарады. Байцы ўпарта ішлі наперад. Калі да вышыні заставалася каля 400 метраў, агонь прыцiснуў іх да зямлі. Здавалася, атака захлынулася.

У гэты крытычны момант сяржант Аліеў загадаў радавым Махамбетаву і Глушэнку разабраць кулямёт, размеркаваў часткі паміж байцамі і ўзяў напрамак у бок фронту. Шлях перагарадзіла балота. Сяржант Аліеў першым уступіў у багну. Па грудзі ў гнілой вадзе, трымаючы над галовамі часткі кулямёта і каробкі з лентамі, байцы фарсіравалі балота. Ім удалося непрыкметна пранікнуць у фланг праціўніка. Выбралі пазіцыю, замаскіраваліся і, сабраўшы кулямёт, адкрылі агонь па ворагу. Вышыня была ўзята.

Артылерысты 4-й батарэі, фарсіраваўшы Прыпяць, устанавілі гарматы каля берага. Неабходна было наладзіць сувязь са стралковым падраздзяленнем. Але бераг ракі густа замініраваны, чакаць сапёраў няма калі. Заставаўся адзін выхад — цягнуць сувязь праз балота, якое не замініравана. За ім пільна назіралі нямецкія снайперы. Як быць? Радавы Клесуноў умацаваў катушку з тэлефонным дротам на камянях, каб яна магла свабодна круціцца. Затым прывязаў да нагі канец дрота і, прыціскаючыся да зямлі, папоўз... Сувязь са стралковым падраздзяленнем была ўстаноўлена.

На другі дзень наступлення камандны пункт перамясціўся на левы бераг Прыпяці. Палкоўнік Шмыглёў рашыў перакінуць 111-ы полк пры дапамозе брыгады рачных катэраў на плацдарм, захоплены 107-м палком пад Навасёлкамі, і развіваць наступленне. У 228-ы полк ён накіраваў свайго намесніка палкоўніка Паляткова.

...Стаяла глыбокая ноч. Бой нарастаў, ён ішоў ужо на подступах да горада. Размешчаны на высокім беразе ракі, Петрыкаў быў выгадным апорным пунктам для ворага. Ад русла Прыпяці да ўскраіны цягнулася балота, якое знаходзілася пад агнём праціўніка. Наступаць было вельмі цяжка.

Клесуноў з рацыяй за плячыма амаль ушчыльную прабраўся да варожай траншэі. Трапным стрэлам знішчыў фашыста. Выглядзеў участак, дзе не было агнявых кропак, папоўз наперад і хутка аказаўся ў ходзе злучэння, устанавіў рацыю і пачаў карэктаваць агонь сваёй артылерыі з варожай траншэі.

Браты Міхаіл і Сяргей Помазы ішлі ў атаку побач. У ліку першых яны фарсіравалі Прыпяць, разам уварваліся ў варожую траншэю. У жорсткай схватцы быў забіты Сяргей... Упарты

бой у траншэі працягваўся. Нянавісць і гора быццам удзесяцярылі сілы Міхаіла. Ён дагнаў групу фашыстаў, адкрыў агонь з аўтамата. Восем гітлераўцаў адказалі жыццём за смерць Сяргея.

Рашучыя дзеянні 107-га палка, які захапіў плацдарм на левым беразе ракі, дазволілі іншым часцям дывізіі развіць поспех. 111-ы полк пад камандаваннем падпалкоўніка Чарнавусенкі абышоў Петрыкаў з поўначы, перарэзаў шасэйную дарогу, а таксама дарогу Капцэвічы — Петрыкаў і, ствараўшы пагрозу акружэння гарнізона праціўніка, адцягнуў на сябе яго галоўныя сілы, 228-ы полк пад камандаваннем падпалкоўніка Каламацкага, пераадолеўшы багну з паўднёва-ўсходняга боку, у канцы дня 30 чэрвеня ўварваўся ў горад. Петрыкаў быў вызвалены.

Узорнымі і бездакорнымі былі дзеянні брыгады рачных караблёў пры вызваленні Петрыкава. У пісьме, накіраваным камандаваннем дывізіі камандзіру 2-й брыгады капітану другога рангу Міціну і начальніку палітаддзела Мацееўскаму, гаварылася: «Камандаванне і палітаддзел 55-й дывізіі выносяць удзячнасць асабіста вам, чырвонафлоцкаму і афіцэрскаму саставу 2-й брыгады рачных караблёў Дняпроўскай рачной флатыліі за паспяховыя сумесныя дзеянні ў раёне Скрыгалава — Петрыкава і жадае вам далейшых поспехаў у разгроме нямецка-фашысцкіх захопнікаў...»

**НЕЗАБЫЎНАЕ**

...Нашы войскі каля Петрыкава. Ідуць зацяжныя баі. Перастрэлка. Вылазкі разведчыкаў. Байцам бачны разбураныя дамы горада, спустошаныя вёскі... Ноччу кулямётны разлік сяржанта Машкоўскага ўмацоўваў свой рубеж. І раптам сігнал: «Трывога!» Фашысты адкрылі моцны агонь на суседнім участку. Байцы схапілі зброю. Недзе ў цемры пад ботамі зачаўкала твань на балоце, пачулася чужая мова...

— Агонь! — скамандаваў камандзір разліку Машкоўскі. Струмень кулямётнай чаргі секанyў па ворагу. Некалькі цёмных постацей упала, вораг адступіў.

Цяжкі бой з групай фашыстаў вытрымаў яфрэйтар Пестаў. Яго акружылі немцы, воін некалькі разоў быў паранены. І тады ён па тэлефоне выклікаў агонь артылерыі «на сябе». Гэта вельмі цяжка — весці агонь па таварышу. Пестаў быў яшчэ раз паранены асколкам, але застаўся жывым...

У канцы чэрвеня сяржанта Падкоўкіна выклікалі ў штаб. Неўзабаве ён вярнуўся, паклікаў сяржанта Бераставога і радавога Мацюніна.

— Нам загадана даставіць «языка»... Праз дзесяць мінут выходзім.

Варожыя заставы прайшлі паспяхова. У лесе цішыня. Падкоўкін раптам спыніўся, загадаў таварышам схавацца. Побач чулася нямецкая гамонка. Паказалася група фашыстаў. Спыніліся, потым адзін пайшоў направа, астатнія зніклі ў лесе. Падкоўкін нячутнай хадой кінуўся на немца. Берастаўы і Мацюнін — за ім.

— Хэндэ хох! — крыкнуў Падкоўкін. Немец выхапіў гранату і шпурнуў у бок разведчыкаў. На шчасце, яна разарвалася каля сасны і нікога не параніла. Берастаўы, Падкоўкін і Мацюнін навалiлiся на немца, скруцілі...

Вызначыліся ў баях за Петрыкаў камандзіры дывізіёнаў Віталій Сарычаў, Пётр Кудзінаў, камандзір батарэі Фёдар Бурлак, Герой Савецкага Саюза Васіль Сяменчанка і многія іншыя байцы-артылерысты.

28 чэрвеня артылерыя адкрыла ўраганны агонь. Слупы агню і зямлі ўзняліся на варожых пазіцыях. Пайшла ў наступленне пяхота. Пераправа праз Прыпяць рыхтавалася даўно. Была сабрана вялікая колькасць лодак, плытоў, распрацаваны план фарсіравання ракі. Адным з першых да берага Прыпяці падышло аддзяленне сяржанта Макрова. Але ўсе лодкі аказаліся разбітымі мінамі ворага. На чым пераправіцца? Радавы Жулдыгін паплыў на той бок. Хутка ён пераправіў дзве лодкі. Паспяхова пераправіўся праз раку малодшы лейтэнант Карабіцын з узводам аўтаматчыкаў і заняў пазіцыю блізка да пазіцыі непрыяцеля. Немцы адкрылі моцны агонь па пазіцыях Карабіцына, але байцы ўзвода, хоць іх было значна менш, перайшлі ў контрнаступленне, уварваліся ў траншэю ворага. Фашысты не вытрымалі штыкавога ўдару. Чырвонаармейцы захапілі двух палонных, тры кулямёты. Ворагі апамяталіся, адкрылі агонь з усіх відаў зброі. Паранены кулямётчык сяржант Калеснікаў з апошніх сіл адбіваў атакі фашыстаў. Хутка падышла падмога.

Адна за другой знішчаліся агнявыя кропкі ворага. Фашысты імкнуліся зачапіцца за любы ўзгорак, але наступальны парыў нашых байцоў быў імклівы. Ні кулямётны, ні мінамётны агонь ворага не маглі спыніць іх. Умела дзейнічаў узвод малодшага лейтэнанта Гірыча. Адважна змагаліся радавыя Дзямідаў, Уцешаў, Анішчанка і іншыя.

Батальён залёг пад агнём праціўніка. Асабліва небяспечным быў кулямёт у дзоце. Яго чэргі не давалі магчымасці падняць галаву. Снайпер Кірыл Швыдчанка ўзабраўся на дах паўразваленай хаты. Ён бачыў праз аптычны прыцэл, як варухнуўся ў амбразуры кулямётчык, і націснуў курок. Кулямёт сціх. Але забітага ворага замяніў другі. Не паспеў ён прыгнуцца да прыцэлу, як куля знайшла і яго.

Гераічна змагаліся ў баях за вызваленне Петрыкава воіны В. А. Сяменчанка, В. М. Сарычаў, М. А. Малафееў, І. В. Бражнік, Ф. С. Бурлак, Е. Л. Грыцук, Устраханаў з Дагестана, Д. Алекаў, Сямён Мазур, Л. Назараў з Мардовіі і многія іншыя. Вялікія страты панеслі наступаючыя войскі. Пахавалі мы Мікалая Хлябіна з пасёлка Бераснёўка Брагінскага раёна, Васіля Бунчука і іншых баявых сяброў.

*А. В. Карамышаў*, гвардыі капітан,
удзельнік баёў за вызваленне Петрыкаўскага раёна.

## У баях за Петрыкаў

**З успамінаў палкоўніка ў адстаўцы Ф. М. Ярвога, былога начальніка штаба 111-га Лунінецкага Чырванасцяжнага палка 55-й Мазырскай стралковай дывізіі.**

...У бінокль быў добра бачны Петрыкаў. Не дыміліся коміны над хатамі, не было відаць людзей. Ноччу ні аднаго агеньчыка. Горад быў пераўтвораны ў апорны пункт, падвалы і першыя паверхі цагляных будынкаў прыстасаваны для агнявых кропак.

Мы рыхтаваліся да наступлення. Палкавая разведка пад камандаваннем лейтэнанта Мікалая Караля на світанні 14 чэрвеня ўзяла ў палон нямецкага афіцэра. Ім аказаўся камандзір роты 102-й дывізіі гітлераўцаў, які даў каштоўныя звесткі аб абароне праціўніка.

З поўначы быў чутны няспынны далёкі гул. Нашы войскі вялі баі ў раёне Бабруйска. 25 чэрвеня атрымалі баявы загад і мы: ва ўзаемадзеянні з Дняпроўскай флатыліяй фарсіраваць Прыпяць і авалодаць Петрыкавам. Паўднёвы бераг ракі, заняты нашымі войскамі яшчэ зімой, быў палогі, забалочаны, густа парослы хмызняком, а паўночны, на якім умацаваўся вораг,— высокі, круты, з яго добра праглядваліся нашы пазіцыі...

Першым фарсіраваў Прыпяць 1-ы батальён 107-га палка пад камандаваннем капітана Турчанінава. Нечаканай начной атакай чырвонаармейцы выбілі фашыстаў з в. Конкавічы і авалодалі ёю. Батальён капітана Мікалая Прохіна ліквідаваў умацаванні немцаў на паўднёвым беразе Прыпяці, у раёне дарогі Скрыгалаў — Петрыкаў, пераправіўся на паўночны бераг ракі і заняў зыходнае становішча для штурму горада. Байцы батальёнаў, якімі камандавалі Аляксандр Дзюкаў і Ягор Арлоў, выкарыстаўшы плацдарм 107-га палка,



Могила неизвестного солдата у дороги Петриков — Копцевичи

у раёне Конкавіч і Навасёлак пад прыкрыццём дымавой заслоны на бранякатэрах пераправіліся праз раку і нанеслі ўдар, адцягваючы ўвагу асноўных сіл праціўніка.

Кароткую чэрвеньскую ноч мы выкарысталі для падрыхтоўкі да рашучага штурму. Не паспела патухнуць зорка на захадзе, як на ўсходзе з'явілася светла-блакітная стужка, якая нагадвала далёкі пажар. Стала віднець. Ракеты, што бесперапынна пускаў у начное неба вораг, станавіліся ледзь прыкметнымі. Раптам над нашымі галовамі з сухім шоргатам панесліся вогненныя снарады «кацюш». Над пазіцыямі гітлераўцаў узняліся клубы агню і дыму. Прагучала каманда: «Наперад, у атаку!» Пранеслася магутнае «ўра», полк пайшоў на штурм варожых умацаванняў. Магутнага парыву воінаў нельга было ўтрымаць, і хутка вораг пачаў адступаць. Дарога Курыцічы — Петрыкаў была перарэзана, першая задача выканана.

Праз некаторы час вораг контратакаваў пры падтрымцы танкаў з боку Смятаніч. Завязаўся жорсткі бой. 2-і батальён вымушаны быў пакінуць дарогу, заняць абарону абапал яе. Танкі прагрукаталі ў напрамку Петрыкава. Кулямётчыкі — сяржант Яўсей Шчука і радавы Міхаіл Хрэшкаў адсеклі пяхоту ад танкаў, частку знішчылі, уцалеўшыя ворагі павярнулі назад. Танкі без падтрымкі пяхоты сустрэлі агнём з супрацьтанкавых ружжаў воіны 3-га батальёна. Воіны аддзялення сяржанта Грышына пачалі закідваць іх гранатамі. Падбіты першы танк спыніўся, астатнія не адважваліся абыходзіць яго. Дарога была заклінена. Разгарэўся жорсткі паядынак танкаў з нашай пяхотай. Гэта было страшна... Чырвонаармейцы не спынялі стральбу з супрацьтанкавых ружжаў, кідалі гранаты пад гусеніцы браніраваных страшыдлаў. Андрэй Пархоменка і Фёдар Залатарэнка падпаўзлі да абочыны дарогі, выкарыстаўшы «мёртвую» прастору, і кінулі супрацьтанкавыя гранаты пад пярэдні танк. Асколкам Залатарэнка быў забіты, Пархоменка паранены ў плячо... Заціснутыя агнём 2-га і 3-га батальёнаў, на дарозе былі падбіты сем варожых танкаў.

1-ы батальён у гэты час пад моцным кулямётным і мінамётным агнём наступаў па амаль непраходнай мясцовасці ў напрамку паўднёвай ускраіны горада. Гэта быў пякельна цяжкі шлях. У поўны рост ісці нельга, нельга і паўзці па дрыгве. Страты былі надзвычай вялікімі. 2-і і 3-і батальёны, пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, выйшлі на дарогу Капцэвічы — Петрыкаў, але з ходу авалодаць ёю не ўдалося. Прыйшлося зноў уступаць у жорсткі паядынак з фашысцкімі танкамі. Вялікую дапамогу пяхоце аказалі сапёры аддзялення сяржанта Андрэева, якія перанеслі некалькі супрацьтанкавых мін з міннага поля гітлераўцаў і паставілі іх на дарозе танкаў. Два з іх падарваліся, астатнія збочылі, потым павярнулі назад. Нямецкая пяхота, якая прывыкла хадзіць у атаку за танкамі, пазбавілася прыкрыцця, ворагі залеглі. Бой, не заціхаючы, ішоў да вечара.

Другая брыгада катэраў Дняпроўскай флатыліі высадзіла ў той дзень дэсант у в. Дарашэвічы. Была перарэзана дарога Петрыкаў — Жыткавічы і пераккрыты шлях адступлення немцаў. Да зыходу 30 чэрвеня Петрыкаў быў акружаны. З наступленнем цемры пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі 1-ы батальён з поўдня, 228-ы стралковы полк з усходу і 2-і і 3-і батальёны 111-га палка з поўначы атакавалі гітлераўцаў. Праціўнік не вытрымаў націску і, кідаючы тэхніку, пачаў адступаць у напрамку Жыткавіч.

...У той дзень асабліва ўрачыстай здавалася нам вячэрняя зорка. Сонца апусцілася за гарызонт. Петрыкаў быў наш... Нават у змроку было відаць, што горад ляжаў у руінах. Курыўся дым, там і сям дагаралі пажары. Воіны, якія яшчэ не ўздыхнулі з палёгкай пасля цяжкіх кровапралітных баёў, тушылі іх. Усюды былі бачны сляды нядаўняй бітвы, кінутая праціўнікам

падбітая і цэлая тэхніка. Людзей не відаць... Вельмі многа было мін, у наступныя дні аддзяленне сапёраў сяржанта Андрэева абясшкодзіла іх больш за чатырыста.

Мы не затрымаліся ў горадзе. Баявы шлях палка ляжаў далей на захад.

**Дэсант з ракі Прыпяць**

У канцы чэрвеня 1944 г. лінія абароны праціўніка праходзіла па правым беразе р. Пціч і па левым р. Прыпяць. На поўдні і паўднёвым усходзе в. Навасёлкі ён утрымліваў плацдарм на правым беразе Прыпяці. Тут была вялікая колькасць траншэй, бліндажоў, дотаў і дзотаў, падыходы да якіх прыкрыты некалькімі радамі калючага дроту і замініраваны. З боку ракі гітлераўцы прыкрываліся супрацьдэсантнымі перашкодамі і мінамётна-кулямётнымі кропкамі. Русла ракі перакрыта бона-фугаснымі перашкодамі.

На захад ад г. Мазыра дыслацыраваліся злучэнні 61-й і 65-й армій. На іх стыку знаходзілася 2-я брыгада рачных караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, якая ўдзельнічала ў агнявых налётах па скапленнях жывой сілы і тэхнікі праціўніка, у сумесных аперацыях з армейскімі часцямі па захопу палонных, ажыццяўляла супрацьмінную абарону.

28 чэрвеня камандзір брыгады капітан другога рангу Міцін атрымаў баявы загад — высадзіць дэсант 55-й дывізіі на левы бераг Прыпяці на поўдзень ад Скрыгалава. Для высадкі выдзяляўся таксама атрад маракоў флатыліі. Пасля артабстрэлу караблі брыгады высадзілі дэсант маракоў, які замацаваўся на беразе. Услед ішлі падраздзяленні 55-й дывізіі. Праціўнік імкнуўся перашкодзіць высадцы дэсанта, падцягваў рэзервы, аднак пад шчыльным агнём гэта зрабіць было немагчыма. Дэсантнікі расшырылі плацдарм і праследавалі праціўніка ў напрамку в. Навасёлкі. Выключную мужнасць і вытрымку паказвалі маракі-дэсантнікі.

Раніцай 29 чэрвеня караблі брыгады прыступілі да пераправы войск і баявой тэхнікі на левы бераг Прыпяці каля Навасёлак. Дэсант маракоў і ўзмоцненай роты армейскага падраздзялення з баямі ішоў на паўночны захад. Караблі, якія падтрымлівалі дэсантнікаў, натыкнуліся на бона-фугасныя перашкоды, якія трымаліся на стальных тросах. Падыходы да іх былі замініраваны. Пад шквальным агнём маракі прыступілі да пераадольвання гэтага рубяжа.

Увечары камандзір дывізіі паставіў задачу брыгадзе рачных караблёў і флатыліі: артагнём і высадкай дэсантнага атрада маракоў дапамагаць войскам, якія наступалі на Петрыкаў. Для выканання гэтай задачы камандзір дывізіёна капітан трэцяга рангу Міхайлаў выдзеліў атрад караблёў прарыву з дэсантам маракоў. Караблі выйшлі ў раён Петрыкава, але на подступах да яго праціўнік адкрыў мінамётны агонь. Ноччу, не дайшоўшы двух кіламетраў да горада, дэсантнікі высадзіліся з паўднёвага ўсходу яго з задачай разведаць бераг і высветліць абстаноўку.

Раніцай 30 чэрвеня караблі брыгады прыступілі да пераправы двух стралковых палкоў. У канцы дня, удакладніўшы дзеянні з сухапутнымі часцямі і прыняўшы другі дэсантны атрад маракоў, караблі выйшлі непасрэдна ў Петрыкаў. Пад агнём праціўніка дэсант быў высаджаны на заходняй ускраіне горада. Захапіўшы плацдарм, дэсантнікі прабіваліся да цэнтра. Ноччу з 30 чэрвеня на 1 ліпеня 1944 г. часці 55-й дывізіі разам з дэсантам маракоў пры артылерыйскай падтрымцы караблёў флатыліі авалодалі Петрыкавам.

*М. Волкаў,* капітан першага рангу ў адстаўцы.

## В бессильной злобе

Командир 511-го ж/д строительного батальона при 2-й армии. Перевод с немецкого 5.7.1944 г.

Оперативный отдел, дело № 43 Секретно

Касается: донесение о разрушениях
Ссылка: командир 2-й инженерной бригады при группе армий «Центр», оперативный отдел № 326/44 от 3.7.1944 г.

Командиру 2-й инженерной бригады

Ниже прилагается донесение о разрушениях, произведенных в период 26.6—29.6.1944 г. батальоном на ж/д линиях Старушки — Птичь, Старушки—Секеричи... на основании дневных сообщений штаба батальона.

Ж/д линия Старушки — Птичь

26.6.1944 г. Демонтировано 280 м ж/д колеи. 200 м рельсов погружено и вывезено.
27.6.1944 г. Ст. Копцевичи (4-й путь): демонтировано и отправлено 240 м рельсов; демонтировано 250 шпал.
Ст. Муляровка: демонтированы и вывезены сигнальные и предохранительные устройства.
28.6.1944 г. От ст. Коржевка до ст. Копцевичи ж/д полотно поднято шпаловзрывателем, погружено и вывезено.
Ст. Оголичи: демонтированы и вывезены сигнальные и предохранительные устройства.
29.6. 1944 г. Ст. Коржевка — ст. Копцевичи: ж/д полотно в двух местах взорвано.
Демонтированы и вывезены предохранительные и сигнальные устройства на ст. Секеричи, Филатовка, Новоселки, Заполье, Михедовичи.
Ст. Филатовка: взорвано шпаловзрывателем 14 387 м ж/д полотна... Взорваны стрелки, 500 м ж/д ветки к лесозаводу.
Ст. Секеричи: 4670 м ж/д полотна дважды подорвано. Взорвано 8 стрелок. Здание станции и погрузочно-разгрузочная платформа сожжены... Взорвано 8 ж/д мостов.
Ст. Новоселки: взорвано шпаловзрывателем и дважды подорвано 7132 м ж/д полотна.
Подорваны 4 стрелки, сожжено здание станции, подорвана и сожжена погрузочно-разгрузочная платформа.
Ст. Заполье: взорваны 2 водонапорные башни и 2 водоразборные колонки. Уничтожено 4 ж/д моста.

Донесение о разрушениях ж/д сооружений (приложение к карте разрушений)

Ж/д линия Птичь — Старушки (одноколейная):

км. 438—445: колея взорвана на стыках и посредине;
км. 445—444: 280 м колеи демонтировано;
км. 444—450: колея взорвана на стыках и посредине;
ст. Коржевка разрушена;
ст. Копцевичи: 440 м станционной колеи демонтировано, остальная разрушена;
км 450—466: колея взорвана шпалоподрывочным плугом и взорвана на стыках и посредине.

Ж/д Старушки — Бобруйск (одноколейная):

км 75—70: полотно взорвано шпалоподрывочным плугом на стыках и посредине;
км 70—65 — из-за действий противника полотно не подорвано;
км 65—61... км 61—54... 54—52... 50—42 и 41—35: полотно взорвано шпалоподрывочным плугом на стыках и посредине;
ст. Филатовка — 4670 м..., ст. Секеричи — 2280 м..., Новоселки — 2800 м колеи дважды подорвано.

Ж/д линия Старушки — Птичь (наш передний край обороны)

30.6.44. Ст. Коржевка: взорвано 480 м рельсов, 1 стрелка демонтирована и вывезена;
ст. Копцевичи — Старушки: рельсы разобраны и дважды подорваны. Взорвана полевая ж/д линия до ст. Копцевичи.
2.7.44. Ст. Старушки: 1029 м рельсов выездного пути на Секеричи, 800 м рельсов выездного пути на Птичь, 1950 м рельсов запасного пути на Секеричи и 7 стрелок подорвано.
3.7.44. Подорвано 15 стрелок, 1 водокачка, водонапорная башня, водонапорная колонка. Здание диспетчерской службы сожжено.

Ж/д линия Старушки — Секеричи:

ст. Заполье: разобрано 5120 м рельсов;

ст. Михедовичи: км 28—14... 13—2: разобрано 28 697 м рельсов. Взорвано 22 стрелки, 3 погрузочно-разгрузочные платформы, водонапорная станция, 4 крана. Сожжены здания станций. Взорвано 7 ж/д мостов...

Командир батальона майор *Нивелингер*

НИА Беларуси, ф. 4683, оп. 3, д. 967, л. 109—129, 135—136.

Подготовил к печати *В. И. Лемешонок*

## ИЗ ТЕЛЕГРАММЫ НАЧАЛЬНИКА ПОЛИТОТДЕЛА 1-го БЕЛОРУССКОГО ФРОНТА ГЕНЕРАЛ-МАЙОРА С. Ф. ГАЛАДЖЕВА НАЧАЛЬНИКУ ГЛАВНОГО ПОЛИТУПРАВЛЕНИЯ РККА ГЕНЕРАЛ-ПОЛКОВНИКУ А. С. ЩЕРБАКОВУ

Наступающие в районе среднего течения Припяти части 55-й дивизии... освободили от немецкого плена 5650 мирных граждан Петриковского района, согнанных немцами в специальные лагеря для отправки в Германию.

В первом лагере, расположенном в д. Рубча, находилось 350 чел., во втором, у д. Каменка — 300 чел. Третий, самый многочисленный лагерь, находился около села Оголичская Рудня. В этом лагере было 5000 мирных граждан. Освобожденные из фашистской неволи жители рассказывали бойцам и офицерам о чудовищных злодеяниях, которые творили немцы накануне своего отступления из этого района. Они насильно отбирали у родителей детей от 6- до 14-летнего возраста и отправляли их в специальные лагеря, вылавливали женщин и мужчин и гнали их на каторгу в Германию. Тех, кто пытался скрыться или оказывал сопротивление, немцы расстреливали. Уроженец села Средняя Рудня Петриковского района ст. сержант Корж Василий среди граждан, спасенных от угона в немецкое рабство, встретил свою старушку-мать Надежду Аникеевну. Со слезами на глазах она рассказывала, что сделали немцы в селе Средняя Рудня.

— Село наше,— говорила Надежда Аникеевна,— начисто разграблено немцами, молодежь угнана в Германию. Перед отступлением немцы согнали в сарай 70 жителей и подожгли его. Тех, кто пытался выскочить из горящего сарая, немецкие солдаты расстреливали из автоматов.

Население с огромной радостью встречает Красную Армию, оказывая ей всяческую помощь...

ЦАМО РФ, ф. 32, оп. 253352, д. 71, л. 83.

Подготовил к печати *В. И. Лемешонок*

## Петрыкаўшчына памятае

**Чалы Мікалай Палікарпавіч** (н. 24.6.1915 г. у г. Купянск Харкаўскай вобл.), малодшы лейтэнант, камандзір атрада Дняпроўскай ваеннай флатыліі, удзельнік баёў у Вялікай Айчыннай вайне на Беларусі. Камандаваў галаўным атрадам у чатырох дэсантных аперацыях, вызначыўся ў баях за вв. Конкавічы, Скрыгалаў. Загінуў 1.7.1944 г. каля в. Дарашэвічы і там пахаваны.

Бацька героя П. А. Чалы ў 1938 г. незаконна рэпрэсіраваны. З пяцярых братоў Чалых з вайны вярнуліся толькі Міхаіл і Рыгор, трое — Іван, Уладзімір і Мікалай загінулі за Радзіму.

7 сакавіка 1945 г. М. П. Чаламу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго іменем названа вуліца ў Петрыкаве.



М. П. Чалы

«55-я стралковая дывізія, з боем пераправіўшыся на паўночны бераг Прыпяці, разгарнулася фронтам на захад і пачала праследаванне праціўніка ўздоўж ракі. Немцы ўпарта абараняліся на прамежкавых рубяжах. Караблі Дняпроўскай ваеннай флатыліі тры разы прарываліся ўверх па рацэ, высаджвалі дэсанты ў фланг і тыл нямецкіх войск. Дэсантнікі пры артылерыйскай падтрымцы бранякатэраў садзейнічалі часцям дывізіі ў ліквідацыі апорных пунктаў ворага. У гэтых баях актыўна ўдзельнічаў атрад маракоў пад камандаваннем малодшага лейтэнанта Мікалая Чалага...»

«Баявы шлях савецкага Ваенна-Марскога Флоту», Масква, 1974.

Пасля разгрому ворага, акружанага ў раёне Бабруйска, флатылія перайшла на р. Прыпяць. Маракі падтрымлівалі стралковыя часці, якія вызвалялі Палескую вобласць. Малодшы лейтэнант Чалы атрымаў загад падрыхтаваць атрад і ноччу высадзіцца ў раёне Петрыкава. Праз некалькі гадзін камандзір далажыў аб гатоўнасці да правядзення аперацыі. Пасля апоўначы катэры з маракамі атрада Мікалая Чалага выйшлі на заданне. Яны падышлі да месца высадкі дэсанта.

— Разведчыкам — праверыць дарогу! — загадаў Мікалай Чалы.

Маракі пачалі небяспечны шлях наперад. Пераадолелі дротавую загароджу, з асцярогай пачалі прабірацца па мінным полі. Фашысты заўважылі атрад дэсантнікаў, адкрылі артылерыйскі і мінамётна-кулямётны агонь. Гэта прымусіла малодшага лейтэнанта Чалага данесці камандзіру атрада катэраў, што ён пераносіць час атакі і просіць падтрымаць агнём карабельнай артылерыі. Караблі, якія адышлі пасля высадкі дэсанта да супрацьлеглага берага ракі, ударылі з гармат па пазіцыях ворага. Чалы прыняў рашэнне адмовіцца ад першапачатковага плана атакі абысці праціўніка з флангаў. Гітлераўцы не вытрымалі націску маракоў і пачалі адыходзіць. На дапамогу дэсантнікам прыйшла стралковая рота, воіны паступова прасоўваліся ўздоўж левага берага да Конкавіч. Ужо бачны былі хаты вёскі, калі Чаламу данеслі:

— Забіты камандзір роты.

— Прымаю камандаванне ротай. Падрыхтавацца да атакі...

Праз некалькі мінут малодшы лейтэнант Чалы падняўся ва ўвесь рост.

— У атаку! За мной!

Услед за камандзірам пайшлі маракі, не адставалі пехацінцы. Яны кінуліся на пазіцыі гітлераўцаў. Тыя не прынялі рукапашнага бою і пачалі адступаць. Мікалай Чалы разам з двума маракамі захапілі дзот, знішчылі чатырох фашыстаў і дваіх узялі ў палон.

Караблі Дняпроўскай ваеннай флатыліі рухаліся па Прыпяці, і атрад Мікалая Чалага зноў атрымаў загад высадзіцца на левы бераг ракі, каб дапамагчы нашым часцям у авалоданні населеным пунктам Дарашэвічы. Высадзіўшыся на бераг, маракі рушылі да вёскі. Вораг бесперапынна абстрэльваў наступаючых з гармат і мінамётаў, кожны крок наперад даваўся з цяжкасцю, з вялікай крывёй. Камандзір быў наперадзе. Над галавой праносіліся кулі, грымелі ўзрывы снарадаў і мін.

Фашысты супраціўляліся з адчаем асуджаных. Бой працягваўся не адну гадзіну, але спыніць націск наступаючых не магло нішто. Калі маракі былі ўжо на самых подступах да вёскі, куля фашысцкага снайпера абарвала жыццё Мікалая Чалага... Сябры, якія былі побач, пачулі яшчэ яго апошнія словы: «Здаецца, усё... Помніце пра мяне».



Абеліск на магіле Героя Савецкага Саюза М. П. Чалага і яго баявых сяброў

**Из последнего письма Н. П. Чалого родным**

Здравствуйте мама, Володя, Миша, Маруся, Аллочка, Аза и Лиля!

Сейчас лежу на только что отбитой у врага земле в одном из городков Белоруссии. Сегодня третий день, как я не спал, три раза высаживался с десантом моряков, которым я командовал. По болотам, в воде по пояс прошел по тылу десятки километров.

А теперь отдыхаем с матросами моими, гордыми за свою работу, за то, что помогли освободить город... Наша братия наделала много шуму, почти все представлены к правительственным наградам, ну и я, конечно, как командир. Скоро снова пойдем вперед, на эту свору. Ну и бить же будем!

В населенных пунктах жуткие их дела, население стараются угонять и уничтожить.

Надеюсь, со временем увидимся.

Все будет хорошо.

Июнь 1944 г.

*Николай.*

## Подзвіг на беларускай зямлі

**Ахметаў Фатула** (н. 19.4.1918 г.), таджык, удзельнік баёў за вызваленне Беларусі. Камандзір разліку супрацьтанкавага ружжа, вызначыўся пры адбіцці атак непрыяцеля 12 лютага 1944 г. каля в. Перадрэйка Петрыкаўскага раёна.

Загінуў 30.7.1944 г. у Польшчы.

У той лютаўскі дзень 1944 г. вораг усімі сіламі імкнуўся выбіць нашы падраздзяленні з рубяжа перад Прыпяццю. Некалькі атак фашыстаў адбілі воіны часці, у якой служыў старшы сяржант Фатула Ахметаў. Але гітлераўцы пры падтрымцы танкаў зноў пайшлі ў контратаку, імкнучыся прарвацца на ўчастку Перадрэйка — Шастовічы. Артылерыйскага прыкрыцця нашай пяхоты не было, галоўны цяжар адбіцця танкаў лёг на бранябойшчыкаў.

Да пачатку бою Ахметаў са сваім разлікам супрацьтанкавага ружжа выбраў выгадную пазіцыю, выкапаў і замаскіраваў акоп. На іх ішла галаўная варожая машына, якая бесперапынна пасылала з гарматы снарад за снарадам. Ахметаў прыціх у акопе, стараючыся не выдаць сябе. Вось яно, рашаючае імгненне — стрэл, яшчэ адзін — і варожая машына спынілася, паказаўся дымок, потым полымя... Аўтаматчыкі, якія рухаліся ўслед пад прыкрыццём яе бранi, спыніліся , залеглі, на іх абрушыўся агонь пяхоты. Атака гітлераўцаў захлынулася. Яшчэ некалькі разоў яны імкнуліся прарвацца да пазіцый батальёна, але ўсё было дарэмна. Не раз вызначыўся Фатула Ахметаў у тых жорсткіх баях.

Яго шлях па вогненных дарогах вайны ляжаў далей на захад. Ужо ачышчана ад фашысцкай нечысці ўся беларуская зямля, наперадзе ляжала Польшча. Адзін з баёў каля польскага горада Сельдцэ стаў апошнім для Фатулы Ахметава. Ён са сваім разлікам захапіў варожы дзот і знішчыў засеўшых у ім гітлераўцаў, што забяспечыла поспех усяму наступаючаму падраздзяленню нашых байцоў. А хутка ён быў смяротна паранены, і праз некалькі гадзін памёр. Так салдат і не даведаўся, што за мужнасць і гераізм, праяўленыя пры вызваленні Петрыкаўскага раёна, яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Дзве весткі — адна сумная, другая радасная — пайшлі ў далёкі таджыкскі кішлак Унджы амаль адначасова...

*Н. І. Салаўёў*

## Шлях дадому

Напярэдадні вызвалення большасць жыхароў Снядзіна хавалася далёка ад родных мясцін, у лясах Лельчыцкага раёна. Там мы ў студзені 1944 г. сустрэлі нашых воінаў. Вярнуцца ў вёску змаглі толькі ў канцы чэрвеня, калі Петрыкаўскі раён быў вызвалены ад фашысцкай навалы. Наш бежанскі табар, які знаходзіўся каля в. Ліпляны, рушыў у дарогу задоўга да радаснага дня вызвалення. Некаторыя вялі кароў. Ехалі дзве фурманкі. Гэта 62-гадовы

Карл Марцынкевіч і Мікалай Ястрэмскі зберaглі коней і вось цяпер запраглі іх. У старых аднолькавае гора. Іх жонак і дзяцей немцы схапілі зімою ў лесе і з таго часу нічога аб іх невядома.

Ідзе і другая павозка. Гэта едзе галава вялікай сям'і Алісей Дамасевіч. Ён прывучыў кароў запрагацца ў воз, Галубка і Малпа пакорна цягнуць яго.

У вёсцы Свіднае спыніліся на некалькі дзён. Тут Пелагея Клепік атрымала пісьмо з фронту ад сына. Бедная цётка Палажка! Яна сама не свая. З радасці не ведае, што рабіць. Ёй яшчэ і яшчэ перачытваюць пісьмо... Яе сынок, яе Коля жывы! Ён яшчэ задоўга да вайны, са школьнай парты, паехаў вучыцца ў школу ФЗН кудысьці ў Марыупаль. Быў сталяварам... Піша, што ўжо трэці год б'е фашыстаў. Ён ужо лейтэнант, ардэнаносец. Ай, як кепска, што там, у Ліплянах, памёр яго бацька, як бы ён цяпер парадаваўся... Яна не вытрымлівае, і галашэнне разносіцца па наваколлі. Свіднюкі пытаюцца:

— Чаго галосіць гэтая жанчына?

— Ад сына пісьмо з фронту атрымала.

— Дык трэба ж радавацца, што, слава Богу, жывы!

З намі ідзе вайсковец — дэмабілізаваны, з ампутаванай па калена нагой, Хвядос Ястрэмскі — магутны, паўнацелы мужчына. Яго жонка з дачкою таксама дзесьці ў немцаў...

Наступны прыпынак табар зрабіў аж на два тыдні ў Замошшы. Старэйшыя абмяркоўвалі, як ісці далей, ці ў абход на Асавец, ці напрасткі праз шырокія, у некалькі кіламетраў Волахаўскія балоты... І вось вялікае гора! Бедная цётка Палажка — тут яна атрымала вестку аб гібелі Колі. Жанчыны ўсяго лагера супакойваюць бедную кабету і разам з ёю аплакваюць яшчэ адну ахвяру вайны.

Вырашылі ісці праз балоты. І набраліся гора, асабліва з жывёлай. У топкіх мясцінах дарогу вымошчвалі лазою, травою. Як засела ў багне карова Івана Ястрэмскага, дык той у бяссіллі і з роспачы так збіў бедную жывёліну, што потым спіна, нібы барабан, голаю стала.

Удачна абышоўшы мінныя палі, прыбылі ў родныя мясціны. На папялішча не пайшлі, размясціліся ў куранях вакол сяла, на палях і ў блізкіх лясочках, таму што папялішча было замініравана.

Рады былі сустрэчы многія разлучаныя немцамі сем'і. Сустрэлі сваіх жонак і дзяцей Карл Марцынкевіч, Мікалай Ястрэмскі, Хвядос Ястрэмскі...

І тут бяда зноў не абышла бокам цётку Палажку. Ужо восенню, калі жылі ў куранi на папялішчы, падарвалася на міне яе сярэдняя дачушка Ганька. Тут жа непадалёку на вуліцы. Пабегла, каб завярнуць выскачыўшае цялятка — і ў адно імгненне знайшла сваю страшную смерць...

Не знёс пакутлівага існавання і Хвядос Ястрэмскі. Усё ад той жа знясільваючай малярыі ў халодным куранi памерлі спачатку жонка, а потым і ён сам, а таксама некалькі чырвонаармеек, астаўшы малых дзетак круглымі сіротамі...

*В. К. Новак*

## ...ПРЫЙШЛО ДОЎГАЧАКАНАЕ ВЫЗВАЛЕННЕ

*Е. Р. Курленя,* г. Петрыкаў

Вясной 1944 г. мы жылі ў в. Турок. У канцы красавіка вёску абкружылі немцы, пачалі выганяць людзей з хат. Дзяцей і старых, што не маглі рухацца, кідалі на павозкі, астатнія ішлі пешшу. Прыгналі ў Галубіцу, адтуль накіравалі ў Славінск і Капцэвічы... Аказваецца, немцы выконвалі «гуманны» акт — выводзілі насельніцтва з раёна будучых баёў. Жылі мы ў лагеры за калючым дротам на невялікім узвышшы сярод балота. Выкапалі рукамі і палкамі ямку, там назбіралася крыху мутнай, бруднай вады, пілі яе. Іншы раз немцы дазвалялі некалькім чалавекам пайсці ў суседнія вёскі, каб

здабыць якую-небудзь ежу. Усіх нас у лагеры было не менш чым тысяча чалавек... Заядалі вошы, многія паміралі. Малалетніх хлопчыкаў забіралі, моладзь адпраўлялі ў Германію. Мне ўдалося пазбегнуць гэтай долі — хварэла тыфам.

Аднойчы ноччу ў канцы чэрвеня асабліва моцна грымела з боку Петрыкава. Мы думалі — навальніца, аказалася, што ішлі вялікія баі, наступала Чырвоная Армія. Раніцай заўважылі, што нямецкай аховы няма. Некалькі чалавек накіраваліся з лагера ў Капцэвічы, вярнуліся з чырвонаармейцамі... Большай радасці мы не пераЖывалі за ўсю вайну...

*Я. Д. Кабановіч,* г. Петрыкаў

Мы жылі ў Макарычах. Калі пачаліся баі за вызваленне раёна, хаваліся ў лесе. Мне, 18-гадовай, з цяжкасцю ўдалося пазбегнуць угону ў Германію, увесь час даводзілася ўцякаць і хавацца... Не было спакою і ў лесе — галадалі, заядалі камары, невядома з якога боку падсцерагала небяспека... Аднойчы раніцай пранеслася чутка: «Нашы прыйшлі... Выходзьце!» З асцярогай падыходзілі да вёскі — што нас чакае там, ніхто не ведаў. Але ўбачылі ажыўленых, вясёлых аднавяскоўцаў, якія вярнуліся раней, некалькі сваіх салдат — і трывога змянілася радасцю, якую цяжка перадаць словамі. Раптам паветра ў тым месцы, дзе цяпер пабудавана вясковая сталоўка, скалануў выбух. Гэта маладая дзяўчына, Марыя Рыбалка, узарвалася на нямецкай міне...

*А. Р. Прышчэпа,* г. Петрыкаў

Мы жылі ў гарадскім пасёлку на вул. Ленінскай. У 1944 г. мне было шэсць гадоў. Калі ў Петрыкаў увайшлі нашы воскі і па вуліцах грукаталі чырваназорныя танкі, мы выбеглі насустрач. Адзін танк спыніўся, з яго вылез салдат, падхапіў нас, дзяцей, пасадзіў на браню... Правёз недалёка, да будынка, у якім цяпер размяшчаецца музычная школа, але на ўсё жыццё я запомніла тую дарогу на гарачай брані танка...

## У вызваленай вёсцы

Для сяўбы азімых восенню 1944 г. дзяржава выдзеліла насенне жыта. Яно прыбыло на станцыю Капцэвічы. Як даставіць зерне ў калгас? Цягла, коней няма. І пайшлі па яго пешшу, за 15 кіламетраў, жанчыны і дзяўчаты. Праз балота, па кладках, басанож... Насыпалі ў мяшкі па 20 кілаграмаў — і ў зваротны шлях. Абрываліся на кладках у зарасніках і балотах паўз рэчку Бобрык, падалі і зноў уставалі на звілістых сцежках Шановічавай грэблі, Грыцаўскага балота, Доўгага броду. Раніцай, на світанні,— у Капцэвічы, пасля поўдня — назад. І так кожны дзень... Прыступілі да пасяўной. Палеткі запушчаны, зараслі травой. Густым шчаціннем узышлі асіннік, бярэзнік, алешнік. Як хутка ператвараецца ў цаліну пакінутая без догляду зямля! Толькі старыя барозны нагадвалі аб тым, што тут было ворыва.

Знайшлі тры плугі — заржавелыя, пагнутыя, без ручак, адрамантавалі іх. Толькі хто пацягне іх? Цягнуць давялося змучаным, працавітым жанчынам — на іх ускладваўся ў тыя гады ўвесь цяжар работы. Васьмёра запрагаліся ў плуг, за ручкі трымаўся сівабароды стары ці дванаццацігадовы юнак. Аралі, паднімалі цаліну... Следам дзве жанчыны цягнулі драўляную барану. Пасеялі. Зерне, якое засталося, падзялілі на працадні — па 200 грамаў выйшла.

Яшчэ пад Берлінам ішлі баі, калі дзяржава выдзеліла для Палескай вобласці 500 галоў жывёлы, якую размеркавалі па раёнах. Атрымаць яе павінны былі самі, ва Усходняй Прусіі... Прыгнаць за тысячы кіламетраў, па палявых і лясных дарогах, праз сотні населеных пунктаў, па нязведаных мясцінах, дзе яшчэ дзейнічалі банды.

Каго паслаць? Згадзіліся адправіцца ў далёкі небяспечны шлях Ганна Сокал, якая пакінула дома дзесяцігадовых двайнят-дзяўчынак, і пяцідзесяцігадовая Яўгенія Яновіч. Каля года цягнулася падарожжа. Жывёлу прыгналі, усю захавалі. Г. П. Сокал і Я. П. Яновіч былі ўзнагароджаны медалямі «За адвагу»...

*М. П. Шамрыла*

**Сустрэча**

У складзе 55-й стралковай дывізіі мне давялося ўдзельнічаць у вызваленні свайго раёна. У студзені 1944 г. з баямі падышлі да Мазыра. Часці дывізіі сумесна з маракамі Дняпроўскай флатыліі рачных караблёў фарсіравалі Прыпяць у раёне в. Навасёлкі. Неўзабаве вёска была вызвалена, але на яе вуліцах не было відаць людзей. Нікога... А мне так хацелася даведацца, што робіцца ў маёй роднай вёсцы Людзвіноў. Нарэшце сустрэў аднаго старога. Спытаў, што чуваць у Людзвінове, можа, ён ведае каго з маіх.

— Сынок, ведаю толькі, што Людзвіноў немцы спалілі, загінула большасць жыхароў. Дзе тваё бацькі, не ведаю, не чуў...

Сціснулася сэрца, камяк падступіў да горла... Рота рыхтуецца да новага наступлення, адшукваць каго няма часу і магчымасці. Напісаў на кавалку паперы нумар сваёй палявой пошты і перадаў старому: можа, сустрэне каго знаёмых з Людзвінова ці Рудні, дзе ў мяне былі сваякі, паведаміць пра мяне.

Наперадзе — Петрыкаў, цяжкія, кровапралітныя баі. Нарэшце горад наш! Макарычы, Турок... Аднойчы раніцай мяне выклікалі ў штаб дывізіі. Чаго, думаю? А там — мая маці. Слёзы радасці: «Сыночак, жывы!» Стары з Навасёлак усё ж выканаў маю просьбу, перадаў адрас.

Камандаванне адпусціла мяне для сустрэчы з роднымі на два дні. Не пазнаў я Людзвіноў — суцэльнае папялішча... Вялікая брацкая магіла аднавяскоўцаў, сярод якіх нямала маіх родных і сваякоў. Доўга я стаяў каля яе...

Наперадзе былі доўгія і цяжкія дарогі вайны. Вызваляў Лунінец, Пінск, потым Прыбалтыку, каля Рыгі быў паранены. Потым была Фінляндыя, дзе я сустрэў Перамогу. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., звыш 10 баявымі медалямі. А той памятны летні дзень 1944 г. — нібы быў ён учора...

*В. І. Корж*

**МІТЫНГ ПЕРАМОГІ**

Яшчэ ноччу, 8 мая, жыхары горада даведаліся па радыё, што разгром гітлераўскай Германіі закончаны. Кожны з нецярпеннем чакаў раніцы 9 мая. На ўсё жыццё застанецца ў памяці гэты дзень. Чуць свет, як пачала перадавацца з вуснаў у вусны радасная вестка. Ва ўсіх усхваляваныя, радасныя ўсмешкі на тварах. Паціскаюць таварыш таварышу рукі, крычаць «Ура!»... Цалуюцца. Ніхто яшчэ не гаварыў аб мітынгу, а гарадская плошча была ўжо запоўнена людзьмі. Тут трохгадовыя дзеці і 80-гадовыя старыя, дзяўчаты і хлопцы — усе яны чакаюць пачатку мітынгу.

10 гадзін раніцы. На трыбуне сакратар РК КП(б)Б тав. Зярноў. Ён ад імя раённай партыйнай арганізацыі віншуе працоўных горада з днём Перамогі над гітлераўскай Германіяй.

— Нацысцкая машына, — гаворыць Зярноў, — знішчана. Германскаму мілітарызму прыйшоў канец. Народы Еўропы выратаваны ад забойцаў 20 стагоддзя... Толькі савецкі народ, народ-герой змог перанесці ўсе цяжкасці вайны і завяршыць яе Перамогай.

Ад імя былых партызан раёна выступіў дырэктар райпрамкамбіната тав. Кулак. Пасля мітынгу ў горадзе працягвалася масавае гулянне за поўнач.

*А. Цвяткоў*
«Сталінская праўда», 10 мая 1945 г.

# Воины Красной Армии и партизаны, похороненные на территории Петриковского района

## БАБУНИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ СОВЕТ

ДЕРЕВНЯ БОРИЧЕВ

**БОБАЙДА Калистрат Иванович,** р. в 1901 г. в д. Коростяново Почепского р. Брянской обл., ряд., погиб 16.11.1943 г.

**РУМАКОВ Ерофей Ануфриевич,** р. в д. Красница Быховского р. Могилевской обл., ряд., погиб 20.2.1944 г.

**СОКОЛ Селивестр Иванович,** р. в 1899 г. в д. Михедовичи, партизан, погиб 15.1.1944 г.

## ГОЛУБИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ СОВЕТ

ДЕРЕВНЯ СЛАВИНСК

**БЕСПАЛОВ Иван Петрович,** р. в 1924 г., ряд., погиб 28.7.1944 г.

**БУДОВИЧ Максим Семенович,** р. в 1921 г., партизан, погиб в июле 1943 г.

**ГЛАЗКОВ Николай Мартынович,** р. в 1924 г. в с. Поляна Мценского р. Орловской обл., погиб 3.7.1944 г.



Братская могила воинов Красной Армии и партизан в д. Бобрик

**ГРИГОРОВ Сергей Георгиевич,** р. в г. Симферополь, ст. лейтенант, погиб 1.7.1944 г.

**ДЕРЯБКИН Василий Афанасьевич,** р. в 1923 г. в Ростовской обл., ряд., погиб 15.11.1943 г.

**ЖУКОВСКИЙ Григорий Иванович,** р. в 1923 г. в с. Павловка Репкинского р. Черниговской обл., ряд., погиб 3.7.1944 г.

**МАНЦУРОВ Борис Борисович,** р. в 1923 г., матрос, погиб 1.7.1944 г.

**ПЕТРУШЕВИЧ Михаил Андреевич,** р. в с. Киянка Черниговского р., погиб 3.7.1944 г.

**ПЛЕЩАНОВ,** рядовой, погиб 1.7.1944 г.

**ПУЧКОВ Иван Васильевич,** р. в 1924 г., матрос, погиб 1.7.1944 г.

**РОЛИК Иван Романович,** р. в 1924 г. в с. Дюбовка Прилукского р. Черниговской обл., ряд., погиб 28.7.1944 г.

**ТЮЛЕНЕВ Николай Михайлович,** р. в 1925 г. в с. Филимоново Ростовского р. Ярославской обл., матрос, погиб 3.7.1944 г.

**ЧАЛЫЙ Николай Поликарпович,** р. в 1915 г. в г. Купянск Харьковской обл., мл. лейтенант, Герой Советского Союза. Погиб 1.7.1944 г.

## КОМАРОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ СОВЕТ

ДЕРЕВНЯ БОБРИК

**БУГАЕНКО Анатолий Евтронович,** р. на ст. Рахмаковка Днепропетровской обл., капитан, погиб в 1944 г.

**БУХТИН Алексей Степанович,** р. в с. Чемоданки Пензенского р., ряд., погиб 29.1.1943 г.

**ВОЛЫНЕЦ Антон Тимофеевич,** партизан.

**ДАНИЛОВИЧ В. А.,** р. в 1926 г., партизан, замучен 18.8.1943 г.

**ДУБИНА Егор Григорьевич,** партизан.

**ЖУДРО Степан Данилович,** партизан.

**КАЛИНА Григорий Тихонович,** партизан.

**КАШКИН Тимофей Михайлович,** р. в г. Орджоникидзе, лейтенант, умер от ран 23.1.1944 г.

**КРАВЧЕНКО Григорий Тимофеевич,** р. в 1913 г. в д. Буйничи Могилевского р., партизан, погиб 4.2.1943 г.

**КРАСНОВ Александр Иванович,** ряд., погиб 30.2.1943 г.

**МАВЛЮТОВ Талимзян Самутдинович,** ряд., погиб 1.2.1944 г.

**МАУКАШЕВ Павел Михайлович,** р. в с. Головенщино Саратовской обл., мл. сержант, погиб 9.12.1943 г.

**ПРОДАН Иван Федорович,** погиб 8.1.1944 г.

**ПРОКОПЕНКО Кирилл Гаврилович,** р. в 1907 г., погиб 25.1.1944 г.

**РОМАНОВ Иван Романович,** р. в 1915 г., ефр., погиб 20.1.1944 г.

**РЫЛОВ Григорий Иванович,** р. в 1902 г. в

г. Боткинск, ул. Антонова, 114, ряд., погиб 1.7.1944 г.

**СЕЛЮК Вячеслав Степанович,** партизан.

**СЕНЬКО Александр Иванович,** партизан.

**СЕМЕНОВ Николай Алексеевич,** р. в д. Удельная Советского р. Карельской АССР, сержант, погиб 22.1.1944 г.

**СИМАКИН Максим Макарович,** р. в с. Рожки Голицынского р. Пензенской обл., ряд., погиб 22.1.1944 г.

**СИРИКУТ Аркадий Иосифович,** р. в 1910 г., в г. Одесса, Колодезный пер., 3–5, ряд., погиб 20.1.1944 г.

**ТАРАН Данил Терентьевич,** р. в с. Орловка Черниговской обл., ряд., погиб 25.2.1944 г.

**ЦУКРОВ Тит Семенович,** партизан, погиб 1.2.1944 г.

**ЧЕРНЫЙ Петр Григорьевич,** р. в с. Костогрузово Цюрюпинского р. Херсонской обл., ряд., погиб 25.1.1944 г.

**ЧИЖИК Николай Федорович,** р. в п. Копцевичи Петриковского р., партизан, умер 14.1.1944 г.

**ШАБАЛТАС Григорий,** погиб 8.1.1944 г.

**ШТАНЬКО Григорий Евменович,** р. в 1907 г., ряд., погиб 25.1.1943 г.

## КОЛКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ СОВЕТ

### ДЕРЕВНЯ КОЛКИ

**АНТИПОВ Николай Семенович,** р. в 1923 г., погиб 23.3.1944 г.

**АФОНИН Александр Федорович,** погиб 8.2.1944 г.

**БИРЮКОВ Дмитрий Романович,** р. в с. Максимовка Богатовского р. Куйбышевской обл., мл. сержант, погиб 20.2.1944 г.

**БАКУЛИНА Вера Евдокимовна,** р. в г. Новосибирск, ул. Парижской Коммуны, 154, ряд., погибла 27.1.1944 г.

**БОНДАРЕНКО Владимир Николаевич,** р. в 1923 г. на хут. Рыбалкин Алексеевского р. Белгородской обл., мл. сержант, погиб 8.2.1944 г.

**БОНДАРЕНКО Федосий Васильевич,** р. в с. В. Осники Черниговского р., погиб 24.1.1944 г.

**БРУХНО Михаил Иванович,** р. в с. Липа Менского р. Черниговской обл., ряд., погиб 24.1.1944 г.

**БУРАВЛЕВ Николай Абрамович,** р. в д. Чернодье Кромского р. Орловской обл., старшина, погиб 26.1.1944 г.

**БУРБУРСКИЙ Иван Павлович,** р. в с. Припутки Ичнянского р. Черниговской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**БУШМАРЕВ Георгий Иванович,** р. в г. Кандалакша, ул. Ключевая, 6, Мурманской обл., ряд., погиб 24.1.1944 г.

**БЫХОВЕЦ Константин Степанович,** р. в 1925 г. в с. Быхольцоховка Репкинского р. Черниговской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**БИХАРЕВ Иван Павлович,** р. в 1925 г. в д. Морчиха Ветлужского р. Горьковской обл., сержант, погиб 27.1.1944 г.

**ГАЛИМОВ Гид Давлетович,** р. в д. Гумерово (Башкирия), ряд., погиб 9.2.1944 г.

**ГОРШЕНИН Виктор Александрович,** р. в 1923 г. в Хорольском р. Уссурийской обл., ряд., погиб 28.1.1944 г.

**ГОЛУБЦОВ Иван Федорович,** р. в 1920 г., лейтенант, погиб 26.1.1944 г.

**ГРИДНЕВ Александр Николаевич,** р. в с. Б. Избердей Петровского р. Тамбовской обл., ряд., погиб 8.2.1944 г.

**ГРИШИН Яков Матвеевич,** ряд., погиб 25.1.1944 г.

**ГУМЕНЮК Роман Карлович,** р. в Крискавском с/с Коропского р. Черниговской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**ДАШУК Иван Яковлевич,** р. в с. Шаповаловка Борзнанского р. Черниговской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**ДЕГТЯРОВ Сергей Меркулович,** р. в п. Шуйка Звениговского р. Мар. АССР, сержант, погиб 13.6.1944 г.

**ДЖАЛО Кирилл Ульянович,** р. в с. Мохнатин Черниговского р., ряд., погиб 20.1.1944 г.

**ДУВЛЕКАЕВ Авдей Михайлович,** р. в к-зе «Яктынар» Обливского р. Ростовской обл., ряд., погиб 8.2.1944 г.

**ЕГОРОВ Михаил Федорович,** р. в 1918 г. в г. Сасово, погиб 25.1.1944 г.

**ЖАБЛИНСКИЙ Иван Васильевич,** р. в 1908 г. в с. Рябцы Черниговского р. ряд., погиб 27.1.1944 г.

**ЖОЛТАК Николай Саввич,** р. в 1925 г. в д. Кудровка Сосницкого р. Черниговской обл., ряд., погиб 27.1.1944 г.

**ЖАРОВ Иван Семенович,** р. в г. Карачеве, ул. Первомайская, 203, погиб 10.3.1944 г.

**ЖЕВНЯК Василий Адамович,** р. в д. Волоки Хойникского р., погиб в 1944 г.

**ЖУКОВ Николай Павлович,** р. в с-зе «Россошинский» Волгоградской обл., мл. сержант, погиб 8.2.1944 г.

**ИГНАТЕНКО Ульян Антонович,** р. в д. Оперижье Брагинского р. Гомельской обл., ряд., погиб 28.1.1944 г.

**КАШТАНОВ Виктор Яковлевич,** р. в с. Питим Пичаевского р. Тамбовской обл., мл. сержант, погиб 8.2.1944 г.

**КИЯНИЦА Порфирий Яковлевич,** ряд., погиб 19.2.1944 г.

**КОБЯКОВ Николай Павлович,** р. в 1922 г. в с. Уварово Тамбовской обл., погиб 25.6.1944 г.

**КОЗЕЛ Александр Сергеевич,** р. в 1903 г. в д. Моисеевка Мозырского р., ряд., погиб 7.7.1943 г.

**КОЧЕТКОВ Григорий Семенович,** р. в д. Сосновка Мордовского р. Тамбовской обл., ряд., погиб 8.2.1944 г.

**КОРОТИН Леонтий Падифорович,** р. в 1905 г. в Саратовской обл., погиб 27.1.1944 г.

**КУРГАНОВ Владимир Алексеевич,** р. в г. Ташкент, 2-й Пионерский пр. 11, кв. 2, ряд., погиб 26.1.1944 г.

**ЛАЗАРЕНКО Гаврил Иванович,** р. в с. Яновка Черниговского р., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**ЛЕБЕДЕВ Иван Федорович,** р. в 1908 г. в д. Свенловщина Монастырщинского р. Смоленской обл., ряд., погиб 27.1.1944 г.

**ЛЕОНЕНКО Александр Емельянович,** р. в д. Кривча Брагинского р. Гомельской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**ЛЫСЕНКО Филипп Васильевич,** р. в с. Хаенки Ичнянского р. Черниговской обл., ряд., погиб 22.1.1944 г.

**ЛЯЩЕНКО Тимофей Сергеевич,** р. в г. Харьков, лейтенант, погиб 24.1.1944 г.

**МАЛЫШЕВ Сергей Иванович,** р. в 1922 г. в г. Таллин, ряд., погиб 27.1.1944 г.

**МАРКИН Кирилл Кириллович,** р. в 1923 г., погиб 26.1.1944 г.

**МАРУСИН Василий Никитич,** ст. сержант, погиб 24.6.1944 г.

**МАРИНИЧ Михаил Алексеевич,** р. в 1916 г. в д. Козловичи Калинковичского р., ряд., погиб 20.2.1944 г.

**МУТУЗОВ Василий Наумович,** ряд., погиб 28.1.1944 г.

**МЕДИН Федор Петрович,** р. в д. Знаменка Владимирской обл., ряд., погиб 27.1.1944 г.

**МИТЕШОВ Александр Семенович,** р. в д. Новые Турцы Троснянского р. Орловской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**МОРЕЙКО Андрей Федорович,** р. в 1925 г. в г. Славгород Алтайского края, ул. Р. Люксембург, 22, ряд., погиб 27.2.1944 г.

**НАУМОВ Владимир Данилович,** р. в 1912 г. в д. Малая Лозовка Мичуринского р. Тамбовской обл., сержант, погиб 8.2.1944 г.

**НЕЧАЕВ Петр Филиппович,** р. в с. Борилово Орловской обл., ряд., погиб 28.1.1944 г.

**НИКОСЯН Арсен Нагалетович,** р. в 1919 г. в с. Тория Богдановского р. (Грузия), ряд., погиб 8.2.1944 г.

**ПОПКОВ Владимир Яковлевич,** р. в 1924 г., в д. Васильевка Арык-Балыцкого р. Карагандинской обл., мл. лейтенант, погиб 27.1.1944 г.

**ПАНФЕРОВ Евгений Матвеевич,** р. в 1925 г. в с. Куровщино Бондарского р. Тамбовской обл., мл. сержант, погиб 8.2.1944 г.

**ПЕРЕГУДОВ Михаил Васильевич,** р. в г. Балашов Саратовской обл., ул. 1-я Мельничная, 10, ряд., погиб 8.2.1944 г.

**ПЕТЛИН Алексей Степанович,** р. в Первомайском с/с Дергачевского р. Саратовской обл., ефр., погиб 24.1.1944 г.

**ПЧЕЛОВ Александр Михайлович,** р. в д. Есипово Юхновского р. Калужской обл., мл. сержант, погиб 26.1.1944 г.

**РАДЮК Николай Герасимович,** партизан, погиб 10.2.1944 г.

**САВРАНОВ Иван Николаевич,** р. в 1912 г. в ст. Н. Донецкая Тихорецкого р. Краснодарского края, ряд., погиб 24.1.1944 г.

**САЦКИЙ Фома Иванович,** р. в с. Новка Черниговского р., ряд., погиб 28.1.1944 г.

**СЕЛЕНОК Яков Васильевич,** р. в г. Чернигов, ул. Сосновая, 59, ряд., погиб 27.1.1944 г.

**СЕМЕНЯКО Иосиф Ефимович,** р. в с. Черевки Миргородского р. Полтавской обл., сержант, погиб 20.2.1944 г.

**СИВЫЙ Василий Григорьевич,** р. в д. Врянцы Унечинского р. Брянской обл., ряд., погиб 2.3.1944 г.

**СКИДАН Макар Мануилович,** р. в д. Маложин Брагинского р. Гомельской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**СМАЛЬЦЕВ Федор Александрович,** р. в д. Бакуны Брагинского р. Гомельской обл., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**СТЕМЕНКО Петр Павлович,** ряд., погиб 19.2.1944 г.

**ТЕРЕНТЬЕВ Владимир Александрович,** погиб 26.1.1944 г.

**ТИШКОВ Василий Васильевич,** мл. сержант, погиб 29.1.1944 г.

**ТРИНДИН Александр Семенович,** ст. сержант, погиб 22.2.1944 г.

**УГЛЕЦКИЙ Виктор Александрович,** р. в 1903 г. в д. Волынцы Ветлужского р. Горьковской обл., старшина, погиб 24.1.1944 г.

**ЧЕРКАСИН Тимофей Петрович,** р. в 1910 г., ряд., погиб 26.1.1944 г.

**ШАМАЕВ Василий Евдокимович,** ряд., погиб 8.2.1944 г.

**ШЕВЕЛЬ Георгий Николаевич,** ряд., погиб 8.2.1944 г.

**ШЕКУРДИН Иван Яковлевич,** р. в д. Харичи Кировской обл., лейтенант, погиб 26.1.1944 г.

**ШИГОЛЕВ Петр Алексеевич,** р. в с. Благославенка Оренбургского р., ряд., погиб 27.1.1944 г.

**ЯМЩИКОВ Александр Григорьевич,** ряд., погиб 26.1.1944 г.

ДЕРЕВНЯ КОМАРОВИЧИ

**БАЙКОВ Александр Яковлевич,** р. в 1920 г. в д. Комаровичи, партизан.

**ВЛАДЫЧАНСКИЙ Адольф Николаевич,** ряд., погиб 7.5.1943 г.

**ГОРБАЧ Харитон,** р. в д. Новоселки Петриковского р., партизан, погиб 6.11.1943 г.

**ГАВРИКОВ Василий Гаврилович,** ряд., погиб 11.1.1944 г.

**ГОВОРОВСКИЙ Федор Петрович,** р. в 1919 г. в д. Лучицы, партизан, погиб 17.3.1943 г.

**ДАНИЛОВИЧ В. А.,** погиб 17.3.1943 г.

**ДЕГТЯР Михаил Александрович,** р. в 1921 г. в д. Селютичи, партизан, погиб летом 1942 г.

**ДУБИН Андрей Я.,** ряд., погиб 9.12.1943 г.

**ДУБИНА Купрей Николаевич,** р. в 1918 г. в д. Новоселки, партизан, погиб 20.6.1943 г.

**КАТАСАНОВ Василий,** р. в 1919 г., партизан, погиб в сентябре 1943 г.

